
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, . каб не ўмёрлі!
Францішак БАГУШЭВІЧ



НАША СЛОВА

Штотыднёвая газета (Выходзіць з сакавіка 1990 г.) ◈ 41(149) ◈ 13 кастрычніка 1993 г. ◈ Кошт — 5 рублёў.

ПОСТУП ТЫДНЯ



ЦЭНТРАЛЬНАЯ РАДА БСДГ РАСПАЎСЮДЗІЛА ЗАЯВУ «АБ ЭКАНАМІЧНЫМ СТАНОВІШЧЫ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ», у якой, у прыватнасці, гаворыцца: «Эканамічны крызіс у краіне ўступіў у сваю разбуральную стадыю. Апошнія гады і месяцы пракамуністычны ўрад шукаў выйсця з паліўна-энергетычнага крызісу шляхам здачы адной за другой пазіцый незалежнасці і набірання шматмільярдных крэдытаў у Расіі, якія будуць сплочваць не сучасныя правіцелі, а народ і яго нашчадкі.

...Нягледзячы на глыбокі крызіс, урад адмаўляецца ад увядзення нацыянальнай валюты. Замест правядзення самастойнай грашовай палітыкі кіраўніцтва ўрада і Нацыянальнага банка знішчаюць суверэнітэт нашай дзяржавы шляхам уваходжання ў грашовую сістэму Расійскай Федэрацыі...» У сваёй заяве Цэнтральная Рада БСДГ заяўляе, што ўрад Рэспублікі Беларусь, паказаўшы сваю поўную некампетэнтнасць і няздольнасць праводзіць самастойна эканамічную палітыку, павінен пайсці ў адстаўку.

✦✦

7 КАСТРЫЧНІКА Ў МЕНСКУ У ДОМЕ ЛІТАРАТАРА АДБЫУСЯ «КРУГЛЫ СТОЛ» НА ТЭМУ «МОВА НАЦЫІ — МОВА ДЗЯРЖАВЫ», які арганізавала і правяло ТБМ імя Ф. Скарыны. Рэпартаж з «круглага стала» будзе надрукаваны ў бліжэйшых нумарах «Нашага слова» і ў хуткім часе паказаны па тэлебачанні.

✦✦

7 КАСТРЫЧНІКА НА СУСТРЭЧЫ ДЭПУТАТАЎ АПАЗІЦЫІ БНФ У ВЯРХОЎНЫМ САВЕЦЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ З ВЫБАРШЧЫКАМІ ВАЛЯНЦІН ГОЛУБЕЎ ВЫКАЗАЎ ПАТРАБАВАННЕ, каб у будучых дэпутатаў была свая прысяга, што, на яго думку, не дасць магчымасці стаць парламентарыямі тым, хто выступае супраць дзяржаўнай незалежнасці Беларусі.

✦✦

НА ВЫШЭЙШЫХ КУРСАХ КДБ БЕЛАРУСІ распрацавана спецыяльная праграма па вывучэнні беларускай мовы, якую будуць выкладаць вядомыя ў краіне навукоўцы.

Жыццё Таварыства

Ажыццявім задумы ТБМ

21 верасня адбылося сумеснае пасяджэнне сакратарыята Рэспубліканскай Рады і Менскай гарадской арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны.

Вёў пасяджэнне старшыня ТБМ Ніл Гілевіч.

У пасяджэнні бралі ўдзел намеснікі старшыні ТБМ С. Запрудскі, З. Санько, Я. Цумараў, сябры сакратарыята Рэспубліканскай Рады ТБМ і Менскай гарадской арганізацыі ТБМ, старшыня Менскай гарадской арганізацыі ТБМ М. Савіцкі, старшыні раённых арганізацый ТБМ Менска, старшыня рэвізійнай камісіі Рэспубліканскай Рады ТБМ М. Лавіцкі, галоўны рэдактар газеты «Наша слова» Э. Ялугін, прадстаўнікі Менскага гарсавета В. Кузьміч і Г. Вашчанка.

АБМЕРКАВАЎШЫ пытанне аб далейшай рабоце па выкананні Пастановы III з'езда ТБМ, Сакратарыят Рэспубліканскай Рады і Менскай гарадской Рады ТБМ адзначылі, што пасля з'езда Сакратарыятам Рэспубліканскай Рады ТБМ, многімі мясцовымі арганізацыямі ТБМ праводзілася пэўная работа па ажыццяўленні Пастановы III з'езда ТБМ, накіраваная на адраджэнне роднай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця народа. У пачатку мая праведзена навукова-практычная канферэнцыя па пытанні выкладання тэхнічных дысцыплін у ВНУ Рэспублікі Беларусь, а ў канцы чэрвеня — пасяджэнне «круглага стала» з нагоды чацвёртых угодкаў з дня стварэння ТБМ з удзелам прадстаўнікоў арганізацый — заснавальнікаў ТБМ. Сакратарыят Рэспубліканскай Рады ТБМ арганізаваў аператыўную інфармацыю ў сродках масавай інфармацыі — у друку, па радыё і тэлебачанні, якая тычыцца Закона аб мовах Рэспублікі Беларусь, што дзейнічае ўжо тры гады. У тым ліку надрукаваны інтэрв'ю старшыні ТБМ Н. Гілевіча ў газеце «Літаратура і мастацтва», намесніка старшыні ТБМ С. Запрудскага ў газеце «Знамя юности». Значная работа праведзена выдавецкай камісіяй, якую ўзначальвае намеснік старшыні ТБМ Зміцер Санько. Толькі за апошні час выйшлі з друку ў выдавецтве «Навука і тэхніка» кнігі «Нарысы па гісторыі беларускага мастацтва» М. Шчакаціхіна і «Западно-Руссизм» А. Цьвікевіча, зборнік «Голас народа — голас Божы» (лісты і тэлеграмы выбаршчыкаў у абарону роднай мовы, супраць увядзення двухмоўя (пад рэд. Н. Гілевіча), зборнік публіцыстычных артыкулаў Н. Гілевіча па праблемах адраджэння роднай мовы «Як не спыніць узыходу Сонца». У хуткім часе выйдзе з друку брашура

Заканчэнне на с. 2.

●

***ПАДПІСАНЫ УСТАНОЎЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ ГАНДЛЁВАГА ДОМА «БЕЛАРУСЬ» У РЫЗЕ,** створанага па ініцыятыве беларускіх прадпрымальнікаў з Латвіі і пры падтрымцы беларускага ўрада. У задачы дома ўваходзіць забеспячэнне беларускімі таварамі Прыбалтыкі і ўсяго свету праз порты Латвіі і забеспячэнне Беларусі рыбнымі прадуктамі.*

●

БЕЗ БЕЛАРУСКАГА СЛОВА БЕЛАРУСІ НЯМА

Нельга не заўважыць, што апошнім часам значна актывізавалася выдавецкая дзейнасць Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны. Зрэшты, нічога тут дзіўнага, бо моўнае пытанне ў нашых варунках усё больш і выразней набывае значнасць пытання палітычнага.

Мяркуйце самі, мінула тры гады з дня прыняцця Закона аб мовах, які, нагадваем, надаў нашай мове статус адзінай дзяржаўнай мовы Рэспублікі Беларусь. Адпаведныя палажэнні Закона, хоць не без цяжкасцей, далёка не гладка, але ўсё ж увасабляюцца ў жыццё. На родную мову пастунова пераходзяць сярэдняя і вышэйшая школы, культура, асвета, больш яна стала ўжывацца ў навуцы, сродках масавай інфармацыі, у паўсядзённым жыцці. А гэта недвухсэнсоўна азначае, што павароту назад не будзе, што нацыянальнае Адраджэнне — не звыклая часовая кампанія (колькі іх мы ўжо пражылі), а важны накірунак унутранай палітыкі, які з'яўляецца своеасаблівым індыкатарам, нават гарантам суверэннасці і дзяржаўнай незалежнасці Бацькаўшчыны. Натуральна, што ў такіх умовах ворагі беларушчыны ўсіх масцей і адценняў — ад артадаксальных ленінцаў да ваяўнічых праваслаўных цемрашалаў, розных груповак тыпу «Славянского Собора» і «Союза офицеров»— вылезлі з акопаў і пайшлі ў рашучую атаку на беларускае слова. Размовы аб так званым дзяржаўным двухмоўі, якое на практыцы скрозь азначае татальнае вяртанне да гвалтоўнай русіфікацыі, якое (паводле задумак ініцыятараў) павінна падрыхтаваць глебу да страты нашай дзяржаўнай незалежнасці, да вяртання назад у імперыю, вяліся на самым высокім узроўні. Яны запаланілі старонкі пракамуністычных і напалову бульварных газет, літаральна забілі эфір. Таму ТБМ імя Ф. Скарыны рэзка пасіліла прапаганду роднага слова. Апроч рэспубліканскага штотыднёвіка «Наша слова», зараз на месцах выдаецца шэраг газет Таварыства: «Сумежжа»— у Паставах, «Рагнеда»— у Салігорску, «Баранавіцкае слова» і іншыя.

Прапагандзе беларускай мовы і нашай нацыянальнай культуры служаць таксама кнігі, якія апошнім часам выдадзены Таварыствам (дванаццаць назваў). Дзве з іх зусім нядаўна ўбачылі свет у выдавецтве «Навука і тэхніка» (наклад 10 тысяч паасобнікаў). «Голас народа — голас Божы»— так назваў падборку тэлеграм і лістоў выбаршчыкаў у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь у абарону матчынай мовы ўкладальнік і рэдактар аднаго са згаданых выданняў, старшыня Камісіі па культуры, адукацыі і захаванні гістарычнай спадчыны Ніл Гілевіч. Дарэчы, частка гэтых тэлеграм і лістоў друкавалася ў «Нашым слове». Кніжка «Як не спыніць узыходу сонца»— публіцыстычны зборнік Ніла Гілевіча, дзе аўтар горача адстойвае статус беларускай мовы ў якасці адзінай дзяржаўнай мовы роднай Бацькаўшчыны. Назву гэтай кніжкі далі ягоныя радкі з прадмовай да анталогіі «Матчына слова» (Менск, 1991): «Як не спыніць узыходу яснага сонца — так і не стрымаць адраджэнне нашай мовы». А пачынаецца зборнік палымяным выступленнем Н. Гілевіча на рэспубліканскай канферэнцыі, што адбылася 19 траўня мінулага года, «Беларуская мова і незалежны дзяржаўны суверэнітэт». Менавіта тады з трыбуны канферэнцыі старшыня ТБМ падкрэсліў: «Без беларускага слова Беларусі няма!»

Не сумняваемся, што згаданыя выданні ТБМ цёпла сустрэнуць прыхільнікі беларускага нацыянальнага Адраджэння, яны шмат каму дапамогуць адчуць, урэшце, сябе беларусамі... Дададзім, што зараз да друку рыхтуецца яшчэ пяць кніжак, якія будуць пазначаны грыфам Таварыства. Сярод іх асаблівую ўвагу раім звярнуць на наступныя: «Сто пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі» (укладальнікі І. Саверчанка і З. Санько, другое выданне), «Беларусь учора і сёння: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі» (аўтары Я. Найдзюк, І. Касяк), «Пачаткі роднае мовы: дапаможнік для ўсіх» В. К. Раманцэвіч.

Мар'ян ВІЖ.

Ажыццявім задумы ТБМ

Заканчэнне. Пачатак на с. 1.

Л. Лыча «Моўная рэформа 1933 г.», дапаможнік В. Раманцэвіч «Вучымся па-беларуску», зборнік «Сто пытанняў і адказаў па гісторыі Беларусі» і некаторыя іншыя выданні. За гэты перыяд шмат цікавых матэрыялаў з жыцця мясцовых арганізацый ТБМ надрукавана ў газеце «Наша слова».

Нямала цікавых і карысных мерапрыемстваў праведзена мясцовымі арганізацыямі ТБМ. У канцы жніўня супрацоўнікі Сакратарыята Рэспубліканскай Рады ТБМ прынялі ўдзел у свяце, прысвечаным Дню незалежнасці Рэспублікі Беларусь у г. Лідзе. Адметнай падзеяй гэтага свята было адкрыццё помніка Ф. Скарыну. Збудаванне гэтага помніка адбылося па ініцыятыве Лідскай гарадской арганізацыі ТБМ (старшыня Міхась Мельнік). У далейшых планах Лідскай гарадской арганізацыі ТБМ — пабудаваць будынак, у якім размесціцца цэнтр беларускай культуры і нацыянальных традыцый. Цэнтр беларускай культуры створаны пры актыўным садзеянні Полацкай арганізацыі ТБМ.

Змястоўную работу па адраджэнні роднай мовы, нацыянальнай культуры вядзе Маладзечанская гарадская арганізацыя ТБМ (старшыня Цімохін Л. А.). Адметнай рысай дзейнасці гэтай арганізацыі сталі цесныя кантакты з кіраўніцтвам гарсавета. Тут таксама паказаны добры прыклад выкарыстання ў мэтах прапаганды беларускай мовы сродкаў масавай інфармацыі (старонка ў Маладзечанскай гарадской газеце, тэматычныя перадачы ТБМ па гарадскім радыё). І яшчэ адзін цікавы прыклад з дзейнасці гэтай арганізацыі — шырокае далучэнне да праблем ТБМ грамадскасці. Так, усе супрацоўнікі завода парашковай металургіі сталі сябрамі ТБМ. Днямі падаравала Салігорская арганізацыя ТБМ, якую ўзначальвае сябра Сакратарыята Марыя Мацюкевіч, выдаўшы першы нумар газеты «Рагнеда», а некалькі раней у Салігорску пачаў працаваць кіёск ТБМ.

Да нядаўняга часу Круглянскі раён быў у ліку тых, дзе адсутнічала раённая арганізацыя ТБМ, але, дзякуючы падтрымцы кіраўніцтва райсавета, тут створана раённая арганізацыя, якую ўзначальвае загадчыца метадычнай аддзела Цэнтральнай раённай бібліятэкі Святлана Вадап'ян. За кароткі тэрмін Круглянская арганізацыя ТБМ выйшла ў лік найбольш актыўных і ініцыятыўных. Можна было б прывесці нямала і другіх станоўчых прыкладаў дзейнасці мясцовых арганізацый і першасных суполак. Аднак ёсць пільная патрэба засяродзіць увагу актывістаў ТБМ на нявырашаных пытаннях.

У Сакратарыяце Рэспубліканскай Рады ТБМ, у мясцовых арганізацыях ТБМ на нізкім узроўні знаходзіцца арганізацыйна-прапагандысцкая работа. Да цяперашняга часу няма дакладных звестак аб колькасці першасных суполак, аб колькасці сяброў ТБМ у іх. Дрэнна наладжана прапаганда дзейнасці арганізацый ТБМ у сродках масавай інфармацыі (друк, радыё, тэлебачанне). Зусім адсутнічае метадычная работа. Не абагульняецца і не распаўсюджваецца перадавы вопыт лепшых арганізацый ТБМ. Недастаткова клапоцяцца аб павелічэнні колькасці першасных суполак, стварэнні адпаведных умоў для работы арганізацый ТБМ у раёнах, дзе яны адсутнічаюць да гэтага часу, а такіх раёнаў больш за 40.

Сакратарыят Рэспубліканскай Рады не мае планаў работы гарадскіх і раённых арганізацый, адпаведнай інфармацыі аб іх дзейнасці па выкананні рашэнняў III з'езда ТБМ.

Не ўсё робіцца з боку рэдакцыі газеты «Наша слова» па прапагандзе станоўчага вопыту работы арганізацый ТБМ. У некаторых выпадках газета больш нагадвае грамадска-палітычнае выданне. Ёсць патрэба выпрацаваць пэўную сістэму прапаганды самой газеты, асабліва ў перыяд падпіснойі кампаніі.

Не ўсюды наладжана супрацоўніцтва арганізацый ТБМ з мясцовымі арганізацыямі — заснавальнікамі ТБМ, другімі грамадскімі арганізацыямі і ўстановамі.

Сур'ёзнай перашкодай на шляху дзейнасці арганізацый ТБМ з'яўляецца адсутнасць падтрымкі ТБМ з боку дзяржавы. Да гэтага часу актывісты ТБМ не маюць ніякіх умоў для работы, толькі ў некалькіх гарадах (Ліда, Маладзечна, Полацк) ім выдзелены памяшканні.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што ўсе арганізацыі ТБМ працуюць на грамадскіх пачатках. Ні ў адной з мясцовых арганізацый няма штатных адзінак.

Да гэтага часу ў бухгалтэрыі ТБМ адсутнічаюць адпаведныя звесткі, прадугледжаныя Статутам ТБМ па пытаннях фінансавай дзейнасці.

Зыходзячы з пералічаных недахопаў і ўлічваючы вялікую патрэбу ў навядзенні пэўнага парадку ў дзейнасці арганізацый ТБМ у сучасны нялёгкі перыяд, сумеснае пасяджэнне Сакратарыята Рэспубліканскай Рады і Менскай гарадской арганізацыі ТБМ пастанавілі:

1. Прызнаць мэтазгодным у кастрычніку—лістападзе правесці шэраг арганізацыйных мерапрыемстваў па ўдасканаленні дзейнасці арганізацый ТБМ.

У тым ліку:

Правесці рэгіянальныя гарадскія, раённыя канферэнцыі ТБМ, на якіх падвесці вынікі работы па выкананні рашэнняў III з'езда ТБМ, актывізаваць гэтую работу.

Правесці перарэгістрацыю ўсіх першасных суполак, калектыўных сябрын і другіх самадзейных аб'яднанняў ТБМ. Пратаколы і адпаведныя дадзеныя (колькасць суполак і сябраў ТБМ у іх, прозвішчы старшынь намеснікаў, скарбнікаў; адрас, а калі ёсць тэлефон — яго нумар, нумар банкаўскага рахунку; пералік самадзейных аб'яднанняў, прадугледжаных Статутам ТБМ, створаных пры арганізацыі і ТБМ, з кароткай інфармацыяй аб праведзенай рабоце за справаздачны перыяд даслаць у Сакратарыят Рэспубліканскай Рады ТБМ не пазней 15 снежня г. г.

2. Правесці пэўную работу па больш актыўным выкарыстанні сродкаў масавай інфармацыі для прапаганды дзейнасці арганізацый ТБМ. Прызнаць пажаданым стварэнне ўласных сродкаў інфармацыі (газеты або старонкі ў раённых, гарадскіх газетах, тэматычныя перадачы па мясцовым радыё і тэлебачанні і інш.).

3. Правесці ў кастрычніку пасяджэнне «круглага стала» па тэме «Мова нацыі — мова дзяржавы».

4. Правесці пасяджэнне Рэспубліканскай Рады з абмеркаваннем пытання «Аб далейшым удасканаленні дзейнасці арганізацый ТБМ па адраджэнні роднай мовы». Прапанаваць мясцовым арганізацыям ТБМ правесці адпаведныя пасяджэнні або канферэнцыі.

5. Звярнуць увагу ўсіх арганізацый ТБМ на неабходнасць шырокай рэкламы газеты «Наша слова», асабліва ў перыяд падпіснойі кампаніі.

Яшчэ раз звярнуцца да кіраўнікоў рай-, гарвыканкамаў тых раёнаў, у якіх адсутнічаюць арганізацыі ТБМ.

Сакратарыят Рэспубліканскай Рады ТБМ імя Ф. Скарыны.

«Духоўнасць — неабходная і жыццядзейнасці»

Гутарка з загадчыкам аддзела лексікалогіі і лексікаграфіі Інстытута мовазнаўства, доктарам філалагічных навук В. П. Лемцюговай.

— Валянціна Пятроўна, Вас ведаюць у Беларусі як аднаго з вядучых спецыялістаў у галіне мовазнаўства. Раскажыце, калі ласка, як складвалася Ваша навуковая біяграфія?

— Нарадзілася я на ленінградскай зямлі на мяжы з Фінляндыяй. Там у брацкай магіле пахаваны мой бацька, удзельнік Фінскай кампаніі, але карані мае на Беларусі. Яшчэ і сёння стаяць на Магілёўшчыне сялянскія хаты маіх дзядоў і бацькоў, толькі ў іх гаспадараць чужыя людзі. На Магілёўшчыне я закончыла сямігодку, а затым беларускую сярэднюю школу ў горадзе Чавусы. Далейшы мой шлях у навуку праходзіў праз філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Беларускай мове вучылася ў Міхаіла Іванавіча Жыркевіча і Льва Міхайлавіча Шакуна. Пасля заканчэння універсітэта настаўнічала на Валожыншчыне. Выкладала беларускую, рускую, нямецкую мовы, займала пасаду намесніка дырэктара школы па навучанні. З сакавіка 1961 года працую ў Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі. Тут пад кіраўніцтвам акадэміка М. В. Бірылы складвалася мая навуковая біяграфія. Без адрыву ад асноўнай работы я атрымала дыпломы кандыдата і доктара філалагічных навук.

— Вядома, што Вы з 1987 года ўзначальваеце аддзел лексікалогіі і лексікаграфіі ў Інстытуце мовазнаўства. Якія зараз асноўныя накірункі ў рабоце Вашага аддзела?

— Зараз у аддзеле вядзецца праца ў двух напрамках — фундаментальным і прыкладным. Першы з іх разлічаны на паглыбленае даследаванне беларускай мовы, працэсаў фарміравання і развіцця яе лексічнага складу, асаблівасцей семантыкі. Тут мы маем справу з вывучэннем моўнай спадчыны, дзякуючы чаму шырокая грамадскасць атрымае доступ да моўных здабыткаў папярэдніх эпох. За кошт фундаментальных даследаванняў ствараецца навуковая база, на якую павінна абапірацца практычнае мовазнаўства. У рэчышчы гэтага напрамку распрацоўваюцца дзве тэмы — «Слоўнік мовы «Нашай Нівы» і «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» (у адным томе). Другі напрамак арыентаваны на тэматыку, якая мае прыкладны характар і карыстаецца шырокім попытам. Выкананне такіх тэм звычайна плануецца на больш кароткі тэрмін. Дапускаецца замена адной тэмы другой (зразумела, больш актуальнай). Словам, ён больш рухомы. Па кароткатэрміновай праграме створаны такія працы, як «Кіраванне ў беларускай і рускай мовах» (Мн., 1991), «Кароткі слоўнік беларускай мовы», яго выданне ажыццяўляе выдавецтва «Мастацкая літаратура», аднатомны «Русско-белорусский словарь» (у рукапісе).

— Вы сказалі пра распрацоўку «Слоўніка мовы «Нашай Нівы». Чаму менавіта «Нашай Нівы» і — сёння?

— «Наша Ніва» — першая друкаваная газета, якая ўвайшла ў гісторыю Беларусі як своеасаблівы летапіс нацыянальнага адраджэння. Значэнне адраджэння пачатку XX ст. для развіцця беларускай літаратурнай мовы наступных перыядаў велізарнае. У «Нашай Ніве» выразна адбіўся стан беларускай літаратурнай мовы пачатку XX ст. з усімі ўласцівымі ёй супярэчнасцямі. Яна падсумавала ўсё найбольш істотнае ў беларускай нацыянальнай традыцыі і разам з тым заклала трывалы падмурак развіцця беларускай літаратурнай мовы на народнай аснове. У беларусаў гэта адна з аўтарытэтных крыніц пазнання гісторыі роднай мовы. Чаму мы аддаём перавагу слоўніку? Вядома, што працэсы і змены, якія адбываюцца ў мове, найбольш непасрэдна выяўляюцца на ўзроўні слоў і значэнняў. Лексічныя рэсурсы «Нашай Нівы» з'яўляюцца той базай, на аснове якой асабліва выразна абазначыліся тэндэнцыі, характэрныя для развіцця лексічнага складу беларускай мовы. Без уліку гэтых тэндэнцый, без падрабязнай сэнсавай характарыстыкі слоўніка гэтага перыяду немагчыма атрымаць аб'ектыўнае ўяўленне пра тыя семантычныя змены, што адбыліся ў слоўнікавым складзе беларускай мовы ў працэсе яе гістарычнага развіцця. Слоўнік ахоплівае масавы лексічны матэрыял, а значыць, можа аб'ектыўна пасведчыць і паслужыць своеасаблівым арбітрам пры вырашэнні спрэчных пытанняў моўнага мінулага і сучаснага. Ён лепш за якую-небудзь іншую працу здольны перадаць адчуванне духу часу, самабытнасці, шырыні і глыбіні мовы нашаніўскай пары. Спадзяёмся, што яго чакае шчаслівая доля, што ён стане фактам агульнанацыянальнага культурнага значэння, будзе мець шырокі попыт, жыць і гаварыць з наступнымі пакаленнямі, удзельнічаць у стварэнні новых духоўных каштоўнасцей. Не хочацца верыць, што нам суджана дажываць свой век у горкім адчуванні сваёй нязначнасці, непаўнацэннасці, духоўнай абмежаванасці. Але добрай перспектывы мала чакаць, яе трэба набліжаць, на яе трэба працаваць.

— Якія перспектывы развіцця Вашага аддзела?

— Ёсць нямала розных планаў і задум, але рэалізаваць іх з кожным годам становіцца ўсё цяжэй. Аддзел катастрафічна скарачаецца: з 13 вопытных навуковых супрацоўнікаў засталіся толькі 4. Многія перайшлі на працу ў Вярхоўны Савет і Савет Міністраў, у вышэйшыя навучальныя і іншыя ўстановы, дзе ім больш плоцяць. Страты гэтыя вельмі адчувальныя. Каб падрыхтаваць добрага спецыяліста па лексікаграфіі, спатрэбяцца дзесяткі гадоў. Як бачыце, у беларускай лексікаграфіі перспектыва незайздросная.

— Валянціна Пятроўна, Вы пачыналі працаваць у інстытуце малодшым навуковым супрацоўнікам пад кіраўніцтвам Мікалая Васільевіча Бірылы. Гэта ад яго Вашая асаблівая цікавасць да тапанімікі?

— Мікалай Васільевіч Бірыла — заснавальнік бела-

Злачыннасць — нацыянальная пагроза

Кіраўніцтва Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі прыняло незалежнага кандыдата на пост Прэзідэнта РБ графа Аляксандра Прушынскага і яго давераную асобу — старшыню Хрысціянскага дэмакратычнага саюза Беларусі М. Вашкевіча.

У часе працяглай гутаркі былі абмеркаваныя пытанні супрацьстаяння развіццю арганізаванай злачыннасці, справакаванай развалам СССР, якая выйшла на сусветны ўзровень. Адпрацоўвалася магчымасць узаемадзеяння паліцыі Канады, Інтэрпола і МУС РБ.

Старшыня ХДС Беларусі растлумачыў пазіцыю хрысціянскіх дэмакратаў па пытанні барацьбы з арганізаванай злачыннасцю. Дасягнута дамоўленасць аб двухбаковых візітах паліцыі Канады і міліцыі Рэспублікі Беларусь.

Антон КАЗЛОЎСКІ.

Весткі з Віленшчыны

На праспекце Гедыміна адкрыты шапік тутэйшай беларускай фірмы «Гуда». Колькі было рэкламы, спадзяванняў на яго, як на адну з крыніц беларускага Адраджэння! Аднак, за выключэннем некалькіх беларускіх кніжак ды газет, што прадаюцца ўтрая даражэй, усё астатняе на літоўскай мове.

* * *

Па пытанні адкрыцця ў Вільні беларускай гімназіі існуюць прынцыповыя разыходжанні паміж ТБМ і кафедрай беларусістыкі Віленскага педагагічнага універсітэта (сп. Л. Плыгаўка). Так, ТБМ імя Ф. Скарыны Віленскага краю выступае за адкрыццё (аднаўленне) менавіта беларускай гімназіі. Кафедра ж беларусістыкі выступае за беларуска-літоўскую гімназію. Нават заявы (бланкі) сп. Л. Плыгаўка надрукавала на літоўскай мове і раздае іх дзецям і бацькам.

Ю. ГІЛЬ.

Умова годнага існавання любога народа»

рускай анамастычнай школы. Я — адна з першых яго вучаніц. Працаваць з тапанімічным матэрыялам для мяне вялікае задавальненне, бо назвы — не проста моўныя знакі, вуснамі іх гаворыць гісторыя і культура народа.

— А што цяпер, на Вашу думку, адбываецца з тапанімічнай сістэмай Беларусі?

— Тапанімічная сістэма Беларусі падзяляе агульны лёс нашай мовы, яна істотна разрушана. Усталявалася традыцыя, якая ідзе яшчэ з дарэвалюцыйных часоў, перадачы беларускіх тапонімаў у рускай мове па прынцыпу перакладу, а не транскрыпцыі: Николаевщина, а не Микалаевщина, Симоновка, а не Сымоновка, Дмитровичи, а не Змитровичи. У выніку многія беларускія тапонімы ў рускай перадачы страцілі нацыянальную гукавую спецыфіку. Масавае ўкараненне найменняў, утвораных шляхам беларускамоўнай адаптацыі рускіх лексем, такіх, як Пабеда, Акцябр, Лучазарная. Сірэнеўка, прывяло да значнага звужэння лексічнага фонду беларускай мовы ў складзе тапаніміі, да размывання лексічных і граматычных яе асаблівасцей. Надзвычай адчувальныя страты панесла нацыянальная тапанімія ў перыяд кампаніі па перайменаванні населеных пунктаў. У большасці сваёй рускамоўныя назвы, пазбаўленыя якой-небудзь інфарматыўнасці і гістарычнай каштоўнасці, замянілі старыя назвы, якія з'яўляюцца сапраўднымі помнікамі нацыянальнай гісторыі і культуры. Нямала выпадкаў, калі некалькі беларускіх назваў замяняліся якой-небудзь адной. Напрыклад, Радзівілавічы (Лельчыцкі раён Гомельскай вобласці), Койданава (Менская вобласць), Святоцк (Нараўлянскі раён Гомельскай вобласці) у 30-я гады былі заменены назвай Дзяржынск, Скорбічы, Яркі, Рылаўшчына (Брэсцкі, Менскі, Аршанскі раёны) — назвай Дружба. Такім чынам, з сістэмы выпалі цэлыя звёны спрадвечна беларускіх тапонімаў, якія абавязкова трэба вярнуць, каб аднавіць перарваную сувязь часоў.

Пры адсутнасці паралельных беларускіх формаў пачалося павальнае скажэнне беларускай тапаніміі. Многія з назваў у памылковай або скажонай форме замацаваліся афіцыйна, трапілі ў пісьмовыя крыніцы, на карты. І зараз ужо цяжка вызначыць форму правільную і няправільную. Шмат назваў бытуе ў паланізаванай форме: Гродна (у першых пісьмовых дакументах XII ст. Городень, Городно, Городня), Брэст (у летапісах XI ст. Берестье, Берестий), Драгічын (у помніках XVI ст. Дорогичин) і шмат іншых. Я ўжо пісала пра ўсё гэта не раз, таму не хачу лішні раз паўтарацца. Адным словам, тапанімію нашу трэба тэрмінова ратаваць. Адраджэнне разбуранай сістэмы патрабуе ўпарадкавання яе ў адпаведнасці з лексічнымі, граматычнымі і правапіснымі нормамі беларускай мовы. Гэтая задача няпростая, калі ўлічыць, што ўсе назвы трэба папярэдне выверыць непасрэдна на месцы іх бытавання, бо ў найбольш «чыстым» выглядзе яны захаваліся толькі ў народнай памяці.

Вось такі ў агульных рысах стан нашай тапанімічнай сістэмы, істотнай часткі народнай культуры.

— Як Вы мяркуеце, у чым асноўная прычына такога становішча?

— Так склалася гістарычна, што спачатку беларуская тапанімія падпала пад паланізацыю, а ў савецкі час у выніку рэзкага звужэння сферы ўжывання беларускай мовы пачалася інтэнсіўная пераарыентацыя на рускую. Паколькі тапонімы ўсё радзей з'яўляліся ў друку ў беларускамоўнай форме і ўсё часцей у рускамоўнай, апошняя актыўна засвойвалася насельніцтвам. І яшчэ — вельмі ж глыбока пранікла ў наша грамадства бацыла нацыянальнага нігілізму.

— Гэта цяжка — звесці розныя варыянты назвы да якога-небудзь аднаго?

Нельга адраджаць мову, гісторыю, культуру, не давёўшы да ладу рэліктавую частку моўнай і культурна-гістарычнай спадчыны. Назвы геаграфічных аб'ектаў (асабліва назвы населішчаў) выкарыстоўваюцца ў многіх афіцыйных дакументах і публікацыях, наносяцца на карты. Таму і дзяржава, і грамадства вельмі зацікаўлены ў аднастайным іх напісанні. Але ж прыкладна 60 працэнтаў беларускіх тапонімаў не маюць зараз адзінага варыянта напісання. Напрыклад, Качан — Качаны — Качанова; Гацук — Гацукі; Сухавержы — Сухавежа; Альбінск — Альбін; Муравіль — Муравілле; Кучына — Кучын.

Яшчэ ў пачатку 80-х гадоў такое становішча ўспрымалася як ненармальнае. Акадэмік АН Беларусі М. В. Бірыла і доктар геаграфічных навук В. А. Жучкевіч паспрабавалі давесці ўраду неабходнасць франтальнага збору беларускай тапаніміі экспедыцыйным шляхам і знайшлі падтрымку. Сёння ў кантэксце адраджэння гэтае пытанне яшчэ больш актуалізавалася. Толькі цяпер нас не чуюць і не разумеюць. А гэта справа дзяржаўнай важнасці. Калі ў нас будзе дасканалая тапанімічная база, нарматыўныя тапанімічныя даведнікі, то будуць і пісьменныя запісы ў нашых пашпартах, правільныя надпісы на картах і дарожных слупах, будзе ўрэшце спынены працэс скажэння і разбурэння структуры і сістэмы важных гістарычных сведак.

— Цяпер ад урадавых чыноўнікаў часта можна пачуць: спачатку трэба накарміць народ, а потым ужо астатняе. А як культура, тапанімія?

— На маю думку, адсталы ў культурных адносінах, пазбаўлены духоўнай апоры чалавек, няздольны дасягнуць вышынь і ў эканоміцы. Жыццё народаў, раўнадушных да сваёй мовы, культуры, няпоўнае, неглыбокае і нецікавае. Духоўнасць — неабходная ўмова годнага існавання і жыццядзейнасці любога народа. Рана ці позна ўсім нам трэба ўзняцца да разумення гэтага. Вельмі ж горка і крыўдна (нават сытаму) праз усё жыццё адчуць сваю няпаўнасць, ненацыянальнасць і духоўную абмежаванасць.


Гутарыла
Любоў БАРШЧЭЎСКАЯ.

Руплійцы

«Нашыя кнігі чытаюць дзеці...»

Я падняўся на чацвёрты паверх старога будынка і ў шэрагу іншых не адразу знайшоў патрэбныя дзверы. За імі знаходзіўся маленькі пакой з чатырма супрацоўнікамі, два камп'ютэры... Усё гэта больш нагадвала бухгалтэрыю нейкага завода. Але менавіта тут былі падрыхтаваны да выдання кнігі, якія напрасту прымушаюць звярнуць на сябе ўвагу.

Маім суразмоўцам стаў кіраўнік выдавецкага аддзела Беларускага адукацыйна-культурнага цэнтра Зміцер Колас. Яму 36 гадоў, мае досвед у працы выкладчыка французскай мовы і перакладчыка. Пачынаючы з 1983 года ў ягоных перакладах выходзілі кнігі Сартра, Камю, Мапасана. З 1991 года ўзначальвае выдавецкі аддзел.



— Наш выдавецкі аддзел быў створаны як частка Беларускага адукацыйна-культурнага цэтра. Задачай цэнтра стала выхаванне новага пакалення беларускай інтэлігенцыі, таму ягоным ядром стаў беларускі ліцэй. Але як выхаваць дзяцей у новым духу, карыстаючыся старымі падручнікамі? Да таго ж дзеці, атрымліваючы адукацыю па-беларуску, паза школай амаль не бачаць цікавых для сябе кніг, выдадзеных на роднай мове. Сёння сістэма адукацыі пераводзіцца на беларускую мову звычайнымі адміністрацыйнымі метадамі, а беларуская літаратура для дзяцей і падлеткаў амаль не друкуецца ні прыватнымі, ні дзяржаўнымі выдавецтвамі. Таму мы вырашылі рабіць гэта самастойна — выдаваць новыя, арыгінальныя падручнікі і разам з імі — дзіцячую літаратуру на беларускай мове. Апошняе вельмі важна для таго, каб мова навучання стала жывой мовай штодзённага ўжытку. Праблемы, з якімі мы сутыкаемся? Звычайныя праблемы дзяржаўных выдавецтваў: тэхнічная і матэрыяльная слабасць. Першы год свайго існавання мы змарнавалі на пераадоленне тэхнічных цяжкасцей, атрыманне памяшкання, набыццё камп'ютэраў... На другі год мы ўжо маглі рабіць перакладчыкам і мастакам заказы на кнігі. Узялі пазыку, выдалі першую кнігу. Атрыманых грошай хапіла на тое, каб пакрыць выдаткі, набыць паперу і працягваць справу.

Сёлета мы выдалі ўжо чатыры кнігі, пятая здадзена ў друк, рыхтуюцца яшчэ тры. Як ні дзіўна, але галоўнай перашкодай у працы было і ёсць тое, што мы з'яўляемся дзяржаўнай структурай. У друкарнях, дзе мы плацім паводле дзяржаўных расцэнак, нас сустракаюць без захаплення, і заказы падоўгу не выконваюцца. Вось кніга Шарля Пэро, якая, згодна з умовамі, мелася быць надрукаванай не пазней 4 красавіка. Яе выданне затрымана на пяць месяцаў. За гэты час інфляцыя знішчыла значную частку грошай ад прыбытку за кнігу, але мы не можам нават ужыць прадугледжаныя пагадненнем карныя санкцыі, бо на Менскай фабрыцы каляровага друку, якая выконвала заказ, нас напросту не захочуць болей бачыць. Ёсць праблемы і з набыццём паперы.

Што да выдавецкай палітыкі, дык яна акрэсліваецца проста: атрымаць прыбытак, выдаючы беларускую літаратуру. Кнігі на беларускай мове могуць даць зыск, і добры, але пры ўмове бесперапыннай выдавецкай дзейнасці. Найбольш для нас выгадна друкаванне дзіцячых кніг, але, акрамя іх, мы выдаём і навучальную літаратуру, патрэбную ў першую чаргу нашаму ліцэю. Ужо надрукавана хрэстаматыя літаратуры народаў свету для VIII класа, падрыхтавана двухтомная хрэстаматыя для IX класа. Падручнікі не даюць прыбытку, бо друкуюцца малымі накладамі для нашага ліцэя і яго філіяў у Гомелі, Магілёве ды іншых гарадах. Выгадна друкаваць кнігі міжвыдавецкай серыі «Школьная бібліятэка». У гэтым годзе мы выдалі ў ёй «Габсэк» Бальзака, «Прыкуты Праметэй» Эсхіла ды «Антыгону» Сафокла. Прыбыткі дазваляюць пашыраць нашу дзейнасць, каб урэшце забяспечыць дапаможнай літаратурай наш Цэнтр і дзіцячай — усіх жадаючых. Так, наша апошняя кніга — пераклады казак Шарля Пэро — выйшла накладам 70 000 паасобнікаў.

Трэба адзначыць галоўны накірунак дзейнасці аддзела: мы імкнёмся выдаваць менавіта тыя дзіцячыя кнігі, якія ўжо сталі класікай, але дагэтуль не выдаваліся па-беларуску. Так,першым быў зборнік казак графіні дэ Сэгюр — пісьменніцы, вядомай па ўсім свеце, але не ў былым СССР. Вялікую ўвагу мы надаём і мастацкім вартасцям перакладу, карыстаючыся паслугамі як ужо вядомых перакладчыкаў — Баршчэўскага ці Палупанава — так і пачаткоўцаў. Менавіта ў перакладах нашых маладых супрацоўнікаў выйдуць дзве наступныя кнігі: зборнік літаратурных казак ангельскіх пісьменнікаў ды «Казкі трапічнага лесу» Арасіё Кірогі.

Сёння ў краіне дзейнічаюць дзесяткі выдавецтваў — як дзяржаўных, так і прыватных. Але нашая справа — выданне дзіцячай, навучальнай, даведачнай літаратуры ды слоўнікаў на беларускай мове — дазваляе заняць сваё, асобнае месца ў справе кнігадруку. Сёння нашыя кнігі чытаюць дзеці, якія праз дзесяць-пятнаццаць гадоў стануць новым пакаленнем беларускай інтэлігенцыі. І спадзявацца на гэта ёсць падставы.

Запіс У. ПАНАДЫ.
Фота аўтара.

Сусвет чалавечы

Парадуемся за калмыкаў — у іх школа загаварыла на роднай мове

Што падтрымка школы — найгалоўнейшы клопат дзяржавы і яго нельга перадаваць прадпрымальніцкім структурам, мецэнатам, пераканаўча засведчыў сусветны вопыт. Бізнесмен, няхай сабе і самы таленавіты, але не навучаны паважаць правы чалавека і любіць уласную радзіму, можа аказацца і надзвычай небяспечным для суродзічаў, бо дзеля прыватнай сённяшняй выгады можа прадаць усё і ўсіх, што мы часта і назіраем.

У той жа час выдатна, калі прадпрымальнік — патрыёт. Пра гэта сведчыць вопыт Калмыкіі. Здаецца, так яе ўжо абрусілі ў савецкі час, што калмыкі пачалі саромецца размаўляць на роднай мове. Але гэта толькі здавалася. Нават, нягледзячы на цесныя абдымкі вялізнай Расіі, Калмыкія імкнецца захаваць сваю нацыянальную адметнасць, у тым ліку мову. Гэты працэс значна ўзмацніўся, калі прэзідэнтам быў абраны малады прадпрымальнік і блізкі сябра народнага паэта Калмыкіі Давіда Кугульцінава Кірсан Ілюмжынаў. Як сведчыць прэса, ён узяў пад асабістую апеку школу, не шкадуючы для яе і ўласных сродкаў. Вынік: у першых класах цяпер усе прадметы выкладаюцца толькі на калмыцкай мове. Акрамя таго, дзяцей знаёмяць з народнымі звычаямі. Для гэтага ўведзены пасады педагога па нацыянальным выхаванні і настаўніка-старэйшыны з ліку мясцовых жыхароў, якія добра ведаюць нацыянальныя звычаі і фальклор. Ад рэспубліканскага дэпартамента адукацыі пачатковыя класы атрымалі відэамагнітафоны з запісамі казак і п'ес для школьнага тэатра на роднай мове ў выкананні лепшых майстроў, а таксама нацыянальны музычны інструмент — дамбру. Па рашэнні прэзідэнта цяпер дзесяць самых лепшых школьнікаў-выпускнікоў, якія паказалі свае адметныя здольнасці, а таксама засвоілі дзесяць запаветаў калмыцкага народа, будуць накіроўваць для навучання ў прэстыжныя заходнееўрапейскія ВНУ.

У.А.

ГОЛАС ПРАЎДЫ І СУМЛЕННЯ

НАВАТ самы нешчаслівы чалавек не можа сказаць: «Я нарадзіўся і жыў дарэмна». Бо карысць ад жыцця вымяраецца не шчаслівым або няшчасным лёсам, а тым, што чалавек даў другім людзям, чалавецтву, Радзіме.

Нельга сказаць, што Сяргей Грахоўскі быў шчаслівым у асабістым жыцці. Калі апусціць той час, як бегаў басанож і вучыўся ў Глускай сямігодцы, а затым вучыўся на газетна-выдавецкім аддзяленні літфака Менскага пединстытута (вучобу сумяшчаў з працай у газетах «Звязда» і «Чырвоная змена»), то ўсё астатняе яго жыццё паўстае ў змрочных і трагічных фарбах. Лёс гулагаўскага вязня хіба што можна параўнаць з блуканнямі па Дантавым пекле.

Дарога ў грамадскае жыццё пайшла з Менска. Тут ён ажаніўся, атрымаў пакойчык у духпавярховым доме на Цнянскай вуліцы, уладзіўся на работу ў Беларускі дзяржаўны радыёкамітэт. Былі камандзіроўкі ў Дрысенскі раён, дзе на мяжы з Польшчай наладжваліся святочныя радыёперадачы; цікавыя рэпартажы вяліся са студыі, дзе дапускалася свабодная імправізацыя; былі сяброўства, каханне і радасць творчых поспехаў. Шчасце доўжылася ўсяго адзін год. Летам трыццаць пятага ён скончыў інстытут, дваццаць чацвёртага верасня трыццаць шостага яму споўнілася дваццаць тры гады, а дзевятнаццатага кастрычніка яго арыштавалі. Дарэчы, 19-е число ў С. Грахоўскага фатальнае. На яго прыпадаюць арышты, рэабілітацыя, іншыя лёсавызначальныя падзеі. Неяк паэт сумна пажартаваў, што і памрэ ён, мабыць, дзевятнаццатага числа...

...У той вечар С. Грахоўскаму не хацелася вяртацца з работы дамоў. Мучыла нядобрае прадчуванне. Зрабіўшы свае перадачы, ён сноўдаўся па радыёстудыі без справы, гартаў падшыўкі газет. Цудоўны хлопец Юрка Пракапчук — пазней з ім на лагерных нарах разам спаў — паўшчуваў: «Чаго ты тут ашываешся? Ідзі дамоў, цябе ж маладая жонка чакае». І паэт пайшоў. На вуліцы цемра, дождж. Заскочыў у гастраном «пад шпілем», купіў перакуску. Са сваёй вуліцы ўбачыў: у яго пакойчыку гарыць яркае святло, на фоне белай сцяны — чорныя цені... На парозе сустракалі два чалавекі ў форме лётчыкаў. Адзін з іх — знаёмы спартыўны каментатар, неяк разам вялі рэпартаж з футбольнага матча.

— Где вы пропадали до сего времени?

— А навошта я вам патрэбны?

— Вот познакомтесь — ордер на обыск и арест.

Ён адразу паспакайнеў. Пакуль нкусаўцы капаліся ў кніжках, павячэраў і нават паспаў. А пятай гадзіне раніцы пад'ехала машына. Увайшлі яшчэ тры чалавекі: Даўгаленка, будучы следчы, Шліфенсон, начальнік сакрэтна-палітычнага аддзела, і міліцыянер. Выводзілі «пад белы ручкі» ўжо ўпяцёх.

Тых, каго цікавіць жыццё і творчы лёс Сяргея Грахоўскага, адсылаю да яго зборніка «Споведзь» (Мн., 1988), у якім змешчаны аўтабіяграфічныя аповесці («Зона маўчання», «Такія белыя снягі») і выбраныя вершы. Нагадаю, што за гэту кнігу пісьменніку была прысуджана Дзяржаўная прэмія РБ.

Сяргей Грахоўскі дваццаць лепшых гадоў свайго жыцця аддаў ГУЛАГу. Ён падзяліў трагічны лёс свайго пакалення, нацыянальнай інтэлігенцыі, якую сталінска-берыеўскія каты ў 30—50-я гады на Беларусі выкасілі пад корань. У ліку нямногіх выйшаў на волю, вярнуўся да творчай і грамадскай працы і актыўна ўключыўся ў працэс нацыянальнага Адраджэння — служыць ідэі, за якую палеглі тысячы і тысячы лепшых сыноў Бацькаўшчыны. Вядучым у дзейнасці С. Грахоўскага стала імкненне «дапець песню» за сваіх лагерных пабрацімаў — беларускіх пісьменнікаў, дагаварыць недагаворанае з імі, «дапісаць» апошнія радкі іх біяграфій, адшукаць творчую спадчыну, вярнуць забытыя імёны. Старэйшына нашай літаратуры прымае актыўны ўдзел у маральнай рэабілітацыі дзеячаў беларускай культуры, змываючы з іх паклёпніцкія ярлыкі, ацэньваючы іх заслугі з вышыні сённяшняга дня і такім чынам аднаўляючы гістарычную праўду. Яго публічныя выступленні ў друку, па радыё і тэлебачанні, а таксама на вечарах, прысвечаных



памяці рэпрэсіраваных, узбагачаюць гісторыю літаратуры каштоўнымі звесткамі пра творчасць і жыццёвы шлях многіх пісьменнікаў, даносяць да нашчадкаў іх чалавечую непаўторнасць.

Нагадаю вядомыя публікацыі Сяргея Іванавіча ў «Маладосці» і «Полымі», прысвечаныя братам Шашалевічам («Два лёсы — дзве трагедыі», «Праўдзівыя дакументы жыцця» і «Яшчэ раз пра Андрэя Мрыя»), якія дапамаглі вярнуць у літаратуру забытыя імёны. Нагадаю таксама гісторыю з дзённікам Барыса Мікуліча, які быў вывуджаны Сяргеем Іванавічам з архіўных нетраў КДБ, а затым апублікаваны ў «Нёмане». Пры непасрэдным удзеле Грахоўскага пабачыў свет фільм пра аўтара «Запісак Самсона Самасуя» Андрэя Мрыя—Шашалевіча, у якім Сяргей Іванавіч выступіў у ролі апавядальніка.

Шырокі рэзананс у грамадстве атрымліваюць публікацыі С. Грахоўскага ў абарону роднай мовы і культуры («Людзьмі звацца? Многага захацелі» і інш.), у абарону правоў рэпрэсіраваных. Так, у 1990 г. праз газету «Советская Белоруссия» С. Грахоўскі звярнуўся да Старшыні Савета Міністраў Кебіча з адкрытым пісьмом «Взываю к справедливому милосердию», у якім заклікаў Старшыню ўрада «изыскать возможность протянуть руку помощи жертвам геноцида», што прайшлі крыжовы шлях на мяжы жыцця і смерці. Другі зварот Сяргей Іванавіч накіраваў дэпутатам Вярхоўнага Савета — «Прашу ласкі за скалечанае жыццё невінаватых» («Звязда», 1990, № 20), у якім заклікаў «таварышаў дэпутатаў» «разбудзіць сваё сумленне... зрабіць добрую справу хоць для Гісторыі».

Адказу ад уладных асоб Сяргей Іванавіч не дачакаўся. Аднак на публікацыю адгукнуліся многія. «Советская Белоруссия» ад 14 верасня і 19 кастрычніка 1990 г. надрукавала вялікія падборкі чытацкіх водгукаў.

І апошняя гучная справа. У мінулым годзе Сяргей Грахоўскі дамогся рэабілітацыі незаконна рэпрэсіраваных у 1947 г. падлеткаў і маладых настаўнікаў з Паставаў і Глыбокага, што аб'ядналіся ў «Саюз беларускіх патрыётаў», каб бараніцца ад русіфікацыі, захаваць сваю мову, гісторыю і культуру. Юных адраджэнцаў жорстка пакаралі: пасля катаванняў і здзекаў іх засудзілі на вялікія тэрміны зняволення. Тыя, хто вярнуўся з лагера дамоў, насілі ярлыкі «ворагаў народа». Абставіны трагедыі сталі вядомы Сяргею Іванавічу з публікацыі у «Нашым слове». Журналісцкае расследаванне тых даўніх і трагічных падзей правёў рэдактар штотыднёвіка Эрнэст Ялугін. Хоць і цёмная была справа — архіўных матэрыялаў і сведак амаль не было, аднак «раскруціць» яе ўдалося. У выніку са старонках газеты загаварылі ўдзельнікі патрыятычнага гуртка. Іх допісы — «жахлівыя дакументы кашмарнага беззаконня» — моцна ўсхвалявалі Сяргея Іванавіча і падштурхнулі яго да дзеяння. Яго «Балючы ліст» пад назвай «Беззаконне замаруджанага дзеяння» з'явіўся ў «Народнай газеце» 14 мая 1992 г. У ім гаварылася: «Прачытаў у № 16 «Нашага слова» лісты Аляксандры Умпіровіч і Антона Фурса і не мог пракаўтнуць даўкі камяк, ад жалю і спагады, ад абурэння сціснулася збалелае сэрца, слёзы затуманілі вочы... Божа мой! Аж не верыцца, што дасюль яшчэ... не расплюшчылі вочы, не разбудзілі сумленне прапаведнікі стварэння праваной дзяржавы — сённяшнія пракуроры, чыны дзяржаўнай бяспекі і судоў. Як жа жыць далей?» Нагадваючы сутнасць трагедыі, Сяргей Іванавіч адзначыў, што ўся віна юнакоў і дзяўчат была ў тым, што яны «прысягнулі на вернасць Беларусі перад бел-чырвона-белым сцягам і Пагоняй». І пісьменнік запатрабаваў: «Органы Пракуратуры і Трыбунала абавязаны неадкладна перагледзець справу Пастаўскай і Глыбоцкай груп «Саюза беларускіх патрыётаў». Адказаў С. Грахоўскаму праз газету намеснік старшыні КДБ Генадзь Лавіцкі, які, па ўсяму відаць, справу рэабілітацыі патрыётаў узяў у свае рукі. Неўзабаве ў «Народнай газеце» з'явіўся другі яго допіс, дзе ад імя КДБ спадар Лавіцкі паабяцаў: «Усе, хто бязвінна пацярпеў у час рэпрэсій, будуць рэабілітаваны».

У гэтай гісторыі нечакана шчаслівы канец. Сябры «Саюза беларускіх патрыётаў» сапраўды былі рэабілітаваны. У пісьме Аляксандры Умпіровіч да свайго абаронцы ёсць такія радкі: «Дарагі наш Сяргей Іванавіч, дзякуючы Вам, Вашым намаганням, мы і іншыя нашы сябры атрымалі гэтыя доўгачаканыя паперы... Цяпер мы атрымоўваем шмат лістоў ад сваіх сяброў, якія вельмі ўдзячны Вам. Вы і Ваш аўтарытэт, мусіць, мацней за тую непрабіўную сцяну, якая ў рэшце рэшт рушыцца. Хаця і марудна, але справа пайшла. Адзін за другім нашы сябры атрымоўваюць рэабілітацыі... І цяпер, калі мэта наша ніба здзяйсняецца, бо маем свой герб, сцяг і хай сабе яшчэ вельмі кволую незалежнасць, трывога не пакідае нас за Радзіму, за лёс мовы. Будзем спадзявацца, што аб'яднаўшыся ўсе — не загінем. і нашы дзеці і ўнукі будуць жыць шчасліва і адчуваць сябе гаспадарамі на сваёй роднай зямлі».

Будзем спадзявацца і мы. Спадзявацца на тое, што яшчэ не раз учуем мужны і спагадны голас С. І. Грахоўскага ў абарону нашай культуры, нашых творцаў і нашых чалавечых правоў.

Ірына КРЭНЬ.

Беларускае замежжа

Беластоцкі «Часопіс»

Выйшаў чарговы нумар (ліпень—жнівень) Беластоцкага «Часопіса», які на гэты раз мае нямала беларускамоўных матэрыялаў.

«У Беларусі пад канец нямецкай акупацыі крыжаваліся інтарэсы Польшчы і Расеі. Адначасова з уваходам гітлераўскіх войск у чэрвені 1941 года на заходнія абшары Беларусі накіраваўся з Польшчы (Генеральнага Губернатарства) добра сарганізаваны палітычны і адміністрацыйны польскі патэнцыял пад аховай магутнага ўжо ў той час польскага ўзброенага падполля. Апрача польскага падполля, у гадах 1942/43 на тэрыторыі цэлай Беларусі пад нямецкай акупацыяй, дзейнічала таксама савецкае (чытай — расейскае) падполле. Яго мэтай было сарганізаванне шырокай сеткі партызанскіх атрадаў з мэтай адбудовы на Беларусі бальшавіцкага ладу» — так пачынаецца артыкул Яна Жамойціна «Саюз беларускай моладзі», які адкрываецца «Часопіс».

У рубрыцы «Рэцэнзіі» разглядаюцца кніга Міры Лукшы «Дзікі птах верабей», якую выдала Праграмная рада тыднёвіка «Ніва», і кніга Надзеі Артымовіч «З неспакойных дарог», якая выйшла ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», а таксама аналізуецца альманах маладых пісьменнікаў, выдадзены Беларускім літаратурным аб'яднаннем «Белавежа».

«У часе, калі Бельск адбудоўваўся пасля знішчэння татарскім нашэсцем, князь Уладзімір Васількавіч (Філосаф) у 1276 годзе заснаваў Камянец. Неўзабаве, паміж гэтымі гарадамі ўзнікла пастаяннае дарожнае спалучэнне. На «Камянецкім гасцінцы» пачалі ўзнікаць новыя пасяленні, асабліва пасля валочнай памеры ў І пал. XVI ст. Тады былі заснаваны Парцава, Орля, Войнаўка. Так узніклі і Дубічы (Царкоўныя)» — гэта радкі з даследавання Міколы Сахарэвіча «У Дубічах на зыходзе стагоддзя». Чытачоў чакае пачатак гэтай працы.

З літаратурных твораў друкуецца апавяданне Міры Лукшы «Выспа». Ян Жамойцін распавядае пра «Басовішча». Зацікавіць чытачоў і каляндарым свят. «Часопіс» багата ілюстраваны здымкамі з культурнага і грамадскага жыцця беларусаў Беласточчыны.

Н. К.

Вучымся!

Жывое слова

«Лона» і «Улонне»

У ТСБМ падаецца фразеалагізм *на лоне прыроды* са значэннем 'на адкрытым паветры, сярод *прыроды*' і ягоны варыянт *на ўлонні прыроды*. Аднак атаясамляць словы *лона* і *ўлонне* ў сучаснай беларускай мове наўрад ці мэтазгодна. Справа ў тым, што хоць слова *ўлонне* і ўтварылася ад слова *лона*, але значэнне яго значна пашырылася. Калі, напрыклад, у XVI ст. слова *лона* абазначала і грудзі, і жывот, і палавыя органы (гл. і ў «Слоўніку мовы Скарыны». Т. І. Мн., 1977. С. 302), то ўжо ў XIX ст. І. І. Насовіч фіксуе слова *лони* ад неўжывальнага *лоня* (слав. *лоно*) са значэннем 'рукі, ахапак, захоп рукамі', а таксама вытворныя: *влонки, влонне* 'абдым, часткі рук, на якіх трымаюць дзіця; ахапак', *улонки, улонне, улоннико* 'тое самае; абярэмак' (гл. Насовіч І. І. Слоўнік беларускай мовы. Мн., 1983. С. 60, 271, 657). У «Краёвым слоўніку ўсходняй Магілёўшчыны» І. К. Бялькевіча слова *лона* адсутнічае, а аднакаранёвыя *ланка, лантух, лантухі, лантушша* і *ўлоння* абазначаюць розныя паняцці:

ЛАНКА, -і, ж. Сытая гладкая жанчына, таўстуха.

ЛАНТУХ, -а, м. Трыбух, жывот, страўнік.

ЛАНТУХІ, -оў, мн. л. Унутранасці.

ЛАНТУШША, -а, н. Зборн. Лантухі, унутранасці.

УЛОННЯ, -я, н. Улонне, калені.

У «Матэрыялах да абласнога слоўніка Магілёўшчыны» (Мн., 1981) зафіксаваны словы *лано* і *ўлонне* са значэннем 'калена' (Чавускі і Слаўгарадскі раёны), а ў «Слоўніку беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча» знаходзім:

ЛОНКА, ЛОНАЧКА, ЛОНОК ж., м. Луг, лугавая сенажаць.

ЛОНКІ прым. Дугападобны, паўкруглы.

ЛОНКОВЫ прым. Лугавы.

ЛОНТКА ж. Вертыкальны слуп у сцяне, які злучае бярвенні.

ЛОНЧЫК м. 1. Палачка для рэгулявання нацягнутасці пілы. 2. Круты паварот ракі.

ЛОНЧЫЦЦА незак. Змацоўвацца.

УЛОННЕ, УЛОННЯ н. 1. Бярэма. 2. У выразах: Узяць (пасадзіць, лезці) на ўлонне(я) — узяць на рукі, пасадзіць на калені.

УЛОНЬКІ мн. Памянш. да *улонне*.

З прыведзеных народна-дыялектных слоў з адзначанымі значэннямі літаратурных норм лона і ўлонне ў мове літаратурна-мастацкіх твораў знайшлі месца толькі наступныя: «Вечна ён або жор, як у якую прорву, так у свой вялікі *лантух*, каўбасу з салам і сітны хлеб... або малоў усякую лухту» (М. Гарэцкі. На імперыялістычнай вайне), «Чубар... проста спачатку сеў, паклаўшы на *ўлонне* вінтоўку» (І. Чыгрынаў. «Плач перапёлкі»).

Мікола АБАБУРКА.

Беларусы-філолагі

Ён слухаў і запісваў

Як зайчасна пайшоў ад нас Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі! Яму ж было б цяпер толькі 75 гадоў. І колькі слоў пачуў бы ён ад людзей па-над Нёманам, Шчарай, Прыпяццю... І колькі «абразкоў» напісаў бы, а магчыма, нават і вялікую кнігу пра дарагіх яму простых людзей, пра сустрэчы з родным словам, з роднаю песняю.

Фёдар Міхайлавіч любіў і ўмеў слухаць, умеў занатоўваць — гэта таксама «дар Божы». Так і ствараліся ягоныя «Абразкі» — кароткія літаратурныя шэдэўры, у якіх «само слова гаворыць». Нашаму слову, беларускаму мовазнаўству, беларускай філалогіі прысвяціў ён усё сваё жыццё: даследаваў фанетыку, арфаэпію, лексіку, лексікаграфію, граматыку народнай і літаратурнай мовы. Яго тытанічная праца па аналізу старажытных беларускіх пісьмовых помнікаў завяршылася выданнем «Гістарычнай граматыкі беларускай мовы».

А як ён цаніў чужы даробак, майстэрства нашых пісьменнікаў і паэтаў! Пры ўсёй занятасці знаходзіў час выбіраць з літаратурных твораў словы, што вызначаліся надзвычайнай лаканічнасцю, вобразнасцю, выразнасцю. З вялікай адказнасцю адбіраў Фёдар Міхайлавіч «крылатыя словы» для першага выдання іх асобнай кніжкай — «Крылатыя словы і афарызмы». Яна выйшла ў 1960 г.

Наша газета знаёміць чытачоў з сабранымі ім беларускімі народнымі параўнаннямі.

З. С.

Кароткая энцыклапедыя беларускай мовы

Беларуская мова сярод іншых славянскіх моў, блізкасць якіх тлумачыцца перш-наперш тым, што ў пэўны перыяд продкі сучасных славянскіх народаў жылі разам на параўнальна невялікай тэрыторыі — прарадзіме славян. Зразумела, можна гаварыць і аб так званай праславянскай мове. Гэтую агульную мову ўсіх славян можна ўзнавіць на падставе некаторых старажытных асаблівасцей, што захаваліся ў асобных мовах і дыялектах. Апошнія, паводле меркавання некаторых вучоных, існавалі ўжо ў праславянскай мове. Але ці адпавядалі праславянскія дыялекты сучасным групоўкам славянскіх моў?

Далей пераважалі спробы суаднесці дыялектнае чляненне праславянскай мовы з падзелам славян на заходніх, паўднёвых і ўсходніх. (Ва ўсходнюю групу ўключаюць і беларускую.) Цяпер выказваюцца меркаванні, што гэтыя тры групы ўтварыліся даволі позна ў выніку збліжэння гаворак, якія раней належалі да розных праславянскіх дыялектаў. Ускосна пра гэта сведчаць аднолькавыя ці падобныя племянныя назвы, што цяпер належаць да розных груп. Прыкладам, назву *паляне* насілі славяне, што жылі ў цэнтральнай Польшчы і на Кіеўшчыне. *Дрыгавічы* жылі на поўдні Беларусі, а *другавіты* — у Македоніі, *драўляне*, ці *дзераўляне*, — на Палессі і *дравяне* на Лабе (Эльбе), *смаляне* — у вярхоўях Дняпра і *смаляне (смаленцы)* у Радопскіх гарах на Балканах. Ёсць і летапісныя сведчанні аб значных міграцыях, як, прыкладам, аб прыходзе радзімічаў і вяцічаў «ад ляхаў», г. зн. з захаду.

Дзеля высвятлення месца нашай мовы варта звярнуць увагу на спецыфічныя тыпалагічныя сувязі беларускай мовы з сербахарвацкай у будове склада. А таму слушна выклікае сумненне распаўсюджаны тэзіс аб поўным першапачатковым дыялектным адзінстве ўсходніх славян і тэорыя т. зв. агульнай калыскі ўсіх усходнеславянскіх моў.

Відаць, меў рацыю вядомы мовазнаўца П. Бузук, які даводзіў, што ў старажытнасці мова нашых прашчураў займала цэнтральнае становішча ў славянскім свеце. Цікава, што і традыцыя фарміравання сучаснай беларускай літаратурнай мовы выяўляе выразнае тыпалагічнае падабенства з тэрытарыяльна далёкімі ад яе літаратурнымі мовамі — сербахарвацкай і македонскай. Аснову гэтай традыцыі складае апора на жывую народную мову, фанетычны правапіс і некаторыя іншыя рысы.

Паводле Г. ЦЫХУНА.

«БЕЛАРУСЫ» Яўхіма Карскага — класічнае фундаментальнае даследаванне беларускай літаратуры і народнай творчасці. Выхаду ў свет «Беларусаў» папярэднічала шматгадовая праца Я. Карскага над гістарычнымі крыніцамі, фальклорнымі і этнаграфічнымі запісамі.

Праца складаецца з трох тамоў, з якіх другі і трэці змяшчаюць па тры часткі (выпускі). Усяго было апублікавана сем кніг гэтага ўнікальнага даследавання агульным аб'ёмам 3105 друкаваных старонак.

Першы том — «Беларусы. Уводзіны ў вывучэнне мовы і народнай славеснасці» — выйшаў у Варшаве ў 1903 годзе. У ім аўтар сабраў тыя моўныя асаблівасці, якімі беларусы сталі вылучацца з XIII стагоддзя сярод іншых этнічных груповак усходняга славянства: невыбуховы зычны **г**, нескладовы **ў**, зацвярдзелыя шыпячыя **ж, ч, ш**, афрыката **дз**, склады **гі, кі, хі** на месцы **гы, кы, хы**, склады **ры, лы** на месцы **ро, ло**... Я. Карскі разгледзеў некаторыя лексічныя пазычанні з моў фінскіх, іранскіх, кельцкіх, германскіх ды іншых народаў.

Другі том выйшаў у Варшаве ў 1908 — 1912 гг. пад назвай «Беларусы. Мова беларускага племені» (перавыдадзены ў Маскве ў 1955 — 1956 гг. пад назвай «Беларусы. Мова беларускага народа»). Гэты том складаецца з трох частак (выпускаў): 1. Гістарычны нарыс гукаў беларускай мовы; 2. Гістарычны нарыс словаўтварэння і словазмянення ў беларускай мове; 3. Нарысы сінтаксісу беларускай мовы. У трэцім выпуску падаецца апісанне сінтаксічнага ладу беларускай мовы, асаблівасці старой мовы і сучасных беларускіх гаворак. Я. Карскі аналізуе тыпы простага сказа, спосабы выражэння галоўных і даданых членаў сказа, беспрыназоўнікавыя і прыназоўнікавыя словазлучэнні ды іншыя моўныя з'явы сінтаксічнага характару.

Для мовазнаўства мае важнае значэнне і трэці том «Беларусаў», які змяшчае «Нарысы славеснасці беларускага племені»: выпуск 1. Народная паэзія (М., 1916); выпуск 2. Старая заходнеруская славеснасць (Пг., 1921); выпуск 3. Мастацкая літаратура на народнай мове (Пг., 1922). Пры аналізе зместу, жанраў і стылістычных асаблівасцей фальклорных і літаратурных твораў даследчык разглядаў звычайна і тыя моўныя сродкі, з дапамогай якіх ствараюцца вобразы, сімвалы, перадаюцца пачуцці і перажыванні герояў. Даследчык правёў цікавыя назіранні над мовай Янкі Купалы, Якуба Коласа ды іншых беларускіх пісьменнікаў.

Навуковымі планамі нашага вучонага было прадугледжана таксама стварэнне поўнага слоўніка сучаснай беларускай мовы і слоўніка старабеларускіх пісьмовых помнікаў. На жаль, яму не давялося здзейсніць свае задумы.

Трохтомнае даследаванне «Беларусы» займае выключнае месца як у гісторыі беларускай, так і наогул славянскай філалогіі. Паводле меркавання вядомых славістаў, агромністы фактычны і бібліяграфічны матэрыял робіць гэтую працу Я. Карскага энцыклапедыяй беларускай філалогіі, адзінай па аб'ёму і багаццю матэрыялаў працы ў сусветнай навуцы.

Паводле М. Г. БУЛАХАВА.

Герман БІДАР (21.10.1941 г., Аўстрыя) — вядомы аўстрыйскі славіст, даследчык беларускай мовы. Вышэйшую адукацыю атрымаў у Акадэміі Венскага гандлёвага аб'яднання па спецыяльнасці перакладчык расійскай мовы. Вывучэнне расійскай мовы прадоўжыў у Венскім універсітэце, дзе і абараніў кандыдацкую дысертацыю. З 1987 г. дацэнт Зальцбургскага універсітэта. Грунтоўнае веданне шматлікіх еўрапейскіх моў, у тым ліку і беларускай, далі яму магчымасць весці лінгвістычныя даследаванні ў шырокім параўнальным дыяпазоне. Г. Бідар распрацаваў і прачытаў шматлікія курсы па агульнай славістыцы і беларускаму мовазнаўству. Найбольш значнае адлюстраванне беларуская тэматыка знайшла ў цыклах лекцый «Нямецка-славянскія моўныя кантакты», «Тэорыя моўных кантактаў» ды інш. Непасрэдна беларускай тэматыцы прысвечаны курс «Беларуская мова для русістаў».

Аб'ектам даследавання Г. Бідара стала і старабеларуская мова XIV—XVII стст. Асабліва шмат увагі аддае ён вывучэнню так званых германізмаў у старабеларускай мове. Характэрна, што даследаванне нямецка-беларускіх моўных кантактаў аўстрыйскі вучоны праводзіць у шырокім агульнаславянскім кантэксце. Г. Бідар склаў аб'ёмную картатэку «Слоўніка германізмаў у старабеларускай мове», які рыхтуецца да выдання.

Вучоны піша манаграфію па нямецка-славянскіх моўных кантактах. Значнае месца ў даследчай працы Бідара займае выданне славянскіх рукапісаў і першадрукаў, якія знаходзяцца ў аўстрыйскіх бібліятэках. Здадзены ў выдавецтва зборнік «Славянскія рукапісы Зальцбургскай універсітэцкай бібліятэкі».

Паводле У. Л. САКАЛОЎСКАГА.

Язык, як перац

Вырабіў зямлю, як пальцамі перамацаў.
Вырабіў зямлю, як пух.
Вырачыў вочы, як баран на новыя вароты.
Вырачыў вочы, як жаба.
Вырваў, як з воўчых зубоў.
Высах, як былінка.
Высах, як мядзведзева лапа.
Высах, як перац.
Высах, як струк.
Высах, як таран.
Высах, як трэска (на трэску, у трэску).
Высах, як шчэпка (на шчэпку, у шчэпку).
Выскаліўся, як сабака на высеўкі (на вожаг).
Выскачыў, як з полымя.
Выскачыў, як Піліп з канапель.
Выскачыў, як чорт з лазы.
Высмажыўся, як скварка.
Высокі, як жардзіна.
Выхапіў, як з агню.
Выцягнуўся, як кнот.
Выцягнуўся, як лут.
Вычысціў, як конь у жолабе (за ноч).
Вялікі, як дуб.
Вялікі (страх), як з леташняга снегу.
Вялікі, як свет.
Вялы, як націна.

Сабраў Ф. Янкоўскі.

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ў пытаннях і адказах

Працяг. Пачатак у №№ 24—37.

Адкуль і калі прыйшла каталіцкая вера на Беларусь?

Паколькі канчатковы падзел хрысціянства на каталіцтва і праваслаўе адбыўся ў 1054 годзе, а аформіўся ў 1204 годзе, то для ранейшага часу больш правільным будзе ўжыванне тэрмінаў «усходні, або візантыйскі, абрад» (пазней — праваслаўе) і «заходні, або рымскі, абрад» (пазней — каталіцызм).

Гістарычныя крыніцы не даюць адназначнага адказу на пытанне: адкуль і калі было прынятае хрысціянства на Беларусі? У Полацкім княстве ўсходні абрад, хутчэй за ўсё, быў прыняты непасрэдна з Візантыі і можа нават раней, чым у Кіеве. Ёсць шэраг падстаў, каб сцвярджаць, што адначасова і паралельна ў нас пашыралася і хрысціянства заходняга абраду. Вялікую ролю ў гэтым напачатку адыгралі заходнія місіянеры. Найбольш вядомы з першых прапаведнікаў Слова Божага — святы Бруна Баніфацый, забіты мясцовымі паганцамі ў 1009 годзе недзе на тэрыторыі Беларусі. Каля 1010 года тураўскі князь Святаполк разам са сваімі падданымі прыняў хрост паводле заходняга абраду ад нямецкага біскупа Рэйнберна. Пазней Тураўскае біскупства згадваецца пад 1105 годам ў Кіева-Пячорскім патэрыку. Як паказваюць матэрыялы раскопак і архіўныя крыніцы, «лацінскія бажніцы» існавалі ў XII стагоддзі ў Полацку і Смаленску. З канца таго ж стагоддзя на тэрыторыю Полацкага княства пашырыўся ўплыў створанага ў 1188 годзе Лівонскага біскупства. У першай палове XIII стагоддзя на полацкіх землях дзейнічала «Русінскае» біскупства, уключанае ў 1255 годзе ў новастворануй Рыжскую мітраполію.

У XI—XIV стагоддзях у пашырэнні заходняга абраду на нашых землях прыкметную ролю адыгралі гандлёвыя і культурныя дачыненні з краінамі Заходняе Еўропы, асабліва германскімі, кантакты з Нямецкім і Лівонскім ордэнамі. З другой паловы XIII стагоддзя за духовы ўплыў на беларускія землі пачаў змагацца і польскі касцёл. Аднак першая ягоная спроба дамагчыся пратэктарату над нашым рэлігійным жыццём скончылася няўдачаю. У год каранацыі навагародскага князя Міндоўга, у 1252 годзе адбылося прызначэнне каталіцкага біскупа для ўсяе тэрыторыі, падпарадкаванай князю. На гэтую пасаду спачатку быў кансекраваны польскі дамініканец Віт. Але з нейкіх прычынаў Віт не быў дапушчаны да кіравання дыэцэзіяй; паводле некаторых звестак, ён нават быў паранены і выгнаны.

Першым афіцыйным і законным біскупам Вялікага Княства Літоўскага стаў у 1252 годзе немец Хрыстыян. Праз колькі гадоў беларускае біскупства было ператворана ў арцыбіскупства з непасрэдным падпарадкаваннем папскаму пасаду. Таму заснаванае пазней, у 1387 годзе, Ягайлам Віленскае біскупства нельга лічыць першым на тэрыторыі Княства, бо легітымнасць папярэдняга, закладзенага Міндоўгам, пацвярджаецца лістом папы Вітаўту, у якім узнаўляецца даўні прывілей, дадзены Міндоўгу на непасрэднае падпарадкаванне папскаму пасаду. Барацьба за аўтаномію нацыянальнага касцёла ад польскага працягвалася і пасля Вітаўта. Беларуская шляхта дамаглася перавагі: з першых 18 біскупаў толькі тры — першы, трэці і чацвёрты — былі палякі, астатнія — беларусы. Толькі паступова польскі ўплыў пачаў узмацняцца, асабліва пасля катастрафічных войнаў з Масковіяй у XVII стагоддзі.

Алесь ЖЛУТКА.

Хто такі Астафей Валовіч?

Астафей Валовіч (каля 1520—1587) — выдатны палітычны дзеяч эпохі Адраджэння, які нарадзіўся на Гарадзеншчыне. Ён адыграў выключную ролю ў гісторыі нашага гаспадарства. На працягу жыцця Валовіч займаў галоўныя пасады ва ўрадзе Вялікага Княства: найвышэйшага пісара, маршалка дворнага, земскага падскарбія (1561—1566), падканцлера (1566—1579), канцлера (1579—1584), троцкага кашталяна (1569—1579), віленскага кашталяна (з 1579) і, нарэшце, віленскага ваяводы (1584—1587). Ён належаў да эліты тагачаснага беларускага грамадства.

Неардынарны талент Астафея Валовіча выявіўся ў часе падрыхтоўкі і рэдагавання другога Статута Вялікага Княства 1566 года. Ён прыклаў неверагодна шмат сілаў, каб і ў законах і ў жыцці адстаяць незалежнасць Беларусі пасля падпісання ганебнай Люблінскай вуніі 1569 года. Як земскі падскарбі Валовіч кіраваў найскладанейшай, але надзвычай неабходнай гаспадарству зямельнай рэформай сярэдзіны XVI стагоддзя. Узначальваючы Дзяржаўную Канцылярыю, ён праявіў выдатныя дыпламатычныя здольнасці, праводзячы замежную палітыку Беларускага гаспадарства, накіраваную на ўмацаванне нашае старажытнае дзяржавы.

А. Валовіч вызначаўся асабістай мужнасцю. Ён быў сярод тых людзей, хто пад сваімі харугвамі вёў беларускае рыцарства да перамогі над Масковіяй у часы надзвычай цяжкай Полацка-Інфлянцкай вайны.

Да таго ж А. Валовіч быў шчодрым мецэнатам. Усведамляючы ролю асветы, пашырэння навукі, ён увесь час дбаў пра развіццё друкарняў, ахвяраваў шмат сродкаў на выданне кніг, утрыманне школаў і навучанне дзяцей. Высокаадукаваны чалавек, А. Валовіч выдатна ўсведамляў, што без асветы, без клопату пра моладзь нацыя не мае будучыні.

Іван САВЕРЧАНКА.

Хто такі Леў Сапега?

Леў Сапега (1557—1633) — зорка першай велічыні на небасхіле палітычнай гісторыі Беларусі. Ён нарадзіўся ў маёнтку Астроўна на Віцебшчыне ў шляхецкай сям'і. Л. Сапега атрымаў бліскучую адукацыю — спачатку ў Нясвіжскай пратэстанцкай школе, а затым у Ляйпцыгскім універсітэце; свабодна валодаў пяццю мовамі.

Па вяртанні з Нямеччыны Л. Сапега быў заўважаны Сцяпанам Батурам і прыняты на службу да вялікага князя. У 1579—1582 гадах ён ваяваў супроць маскоўцаў на чале харугвы.

У 1584 годзе Л. Сапега ўзначаліў надзвычай адказнае пасольства ў Маскву, у часе якога выявіў неардынарныя дыпламатычныя здольнасці, дамогшыся падпісання вельмі выгаднага для Беларусі «вечнага міру», за што і быў у 1585 годзе прызначаны на пасаду падканцлера.

Як падканцлер, а з 1589 года як канцлер Л. Сапега кіраваў замежнай палітыкай Беларускага гаспадарства і прыкметна ўплываў на ўнутранае жыццё краіны. Першарадная заслуга Л. Сапегі ў тым, што ён падрыхтаваў і дамогся зацверджання Статута 1588 года, які гарантаваў эканамічную, палітычную ды культурную незалежнасць Вялікага Княства ад суседніх Польшчы і Масковіі. Істотна і тое, што ён ужо тады з'яўляўся прыхільнікам не абагоўленай манархіі, а моцнай дэмакратычнай, прававой дзяржавы, дзе, паводле ягоных слоў, «павінны панаваць законы, а не асобы».

Л. Сапега адыграў вырашальную ролю ў часе буйных ваенных кампаніяў на ўсходзе ў 1609—1611 і 1617—1618 гадах. Дзякуючы ягонай асабістай мужнасці і палітычнаму таленту, Беларускае гаспадарства тады прыкметна пашырыла свае межы, вярнуўшы назад нашыя старадаўнія землі. Так, паводле ўмоваў Дзявулінскага замірэння ад 1 снежня 1618 года Вялікаму Княству вярталіся Смаленск, Дарагабуж, Белы, Старадуб, Невель, Себеж, Красен, Ноўгарад-Северскі, Вяліжская воласць і Манастырскае гарадзішча.

Пра незвычайнасць асобы Л. Сапегі, яго глыбокі патрыятызм асабліва сведчыць той факт, што ў часе вайны Вялікага Княства са Швецыяй, у 1625—1629 гадах, ён ахвяраваў амаль усю сваю маёмасць на ўтрыманне войскаў, зрабіўшы ўсё магчымае дзеля выратавання Бацькаўшчыны ў тую чорную часіну.

Дзякуючы чыннасці Л. Сапегі, нашае старадаўняе гаспадарства не толькі здолела захаваць сваю незалежнасць у складаны гістарычны момант, але і перажыло новы перыяд эканамічнага ды культурнага росквіту, які з поўным правам можна назваць «эпохаю Льва Сапегі».

Іван САВЕРЧАНКА.

Пра беларускую школу не дбалі

(Школьніцтва на Гомельшчыне ў 1919—1926 г.)

Заканчэнне. Пачатак у № 40.

Адсутнасць партыйнай падтрымкі была адначасова і моцным і слабым месцам беларускага школьніцтва. Можна меркаваць, што змест беларусізацыі на Гомельшчыне пацярпеў ад ідэалагічных догм крыху менш, чым мог бы, калі б быў пад патранажам партыі. Досыць вольна пачувалі сябе павятовыя філіі і гурткі літаб'яднання «Маладняк», якія абралі тактыку лятучых атрадаў.

Беларуская секцыя на пачатку 1926 года запланавала пачаць працу над слоўнікам «Жывой беларускай мовы». Вясной у губерні было ўжо 92 беларускія школы, 10 культурных пляцовак, 72 лікпункты і хаты-чытальні. Тады ж узнік маладзёжны беларускі літаратурны гурток у Клінцах. Наогул моладзь Гомельшчыны была актыўнай сілай беларусізацыі. Нават камсамол, у адрозненне ад старэйшага настаўніка і правадыра — партыі, аказаўся больш памяркоўным у беларускім пытанні: у губерні працавалі 11 беларусізаваных камсамольскіх ячэек.

Аднак развіццё школьніцтва стрымлівалася, бо не было ў губерні стацыянарнага цэнтра падрыхтоўкі беларускіх настаўнікаў і культурных працаўнікоў. Курсы ў Менску, якія вялі кваліфікаваныя навукоўцы Язэп Лёсік, Адам Бабарэка, Аляксандр Цьвікевіч, Усевалад Ігнатоўскі, летнія кароткатэрміновыя курсы ў Гомелі і лекцыі беларусазнаўства ў педтэхнікуме не маглі даць патрэбнай колькасці настаўнікаў высокай кваліфікацыі. Таму беларуская секцыя дамагалася стварэння ў Гомелі беларускага педтэхнікума па ўзоры ўжо адчыненага. Аднак рашэнне гэтай праблемы ўлады Гомеля адкладвалі ажно на пачатак 30-х гадоў.

На Цэнтральныя беларускія настаўніцкія курсы ў Менск летам 1926 г. Гомельшчына накіравала найбольшую ў параўнанні са Смаленшчынай і Пскоўшчынай колькасць настаўнікаў — трыццаць аднаго чалавека. А новы навучальны год павінны былі распачаць ужо 89 беларускіх школ Гомельшчыны. У траўні 1926 г. ЦК КПБ звярнуўся ў вышэйшы партыйны орган — ЦК ВКП(б) з абгрунтаваннем мэтазгоднасці далучэння ўсёй Гомельшчыны да БССР. Масква дала згоду і прапанавала ўраду БССР афіцыйна звярнуцца да ўрада СССР.

А летам беларускія навукоўцы ў межах дзяржаўнай праграмы БССР вывучалі нацыянальную спецыфіку Гомельскай губерні. Вядомы лінгвіст Пётр Бузук па заданні Інстытута Беларускай культуры правёў дыялекталагічную экспедыцыю па раёнах паміж Бранскам, Гомелем, Лоевам і Гародняй (Чарнігаўскай). Ва ўсходніх раёнах Гомельшчыны пабываў А. Сержпутоўскі. Матэрыялы ягонай экспедыцыі неўзабаве былі выдадзены асобнай брашурай пад назвай «Отчёт о поездке в Гомельскую губернию в 1926 г.» (Мн., 1926).

Задачы экспедыцый былі наступныя: па-першае, «вызначыць этнаграфічныя межы беларускай народнасці і мовы з суседнімі велікарускімі і ўкраінскімі плямёнамі і гаворкамі»; па-другое, «зафіксаваць беларускія гаворкі». Па выніках паездкі А. Сержпутоўскі зрабіў наступную выснову: «Пачынаючы ад ракі Дзясны каля Почапа ў Бранскай губерні, па ўсёй Гомельскай губерні ўздоўж ракі Іпуць з паўднёвага боку і да Гомеля, жыве чыста беларускае насельніцтва, бо характар яго паселішчаў, мовы і ўсяго гаспадарчага і дамашняга быту ясна сведчаць пра гэта».

Летам 1926 г. выйшла даследаванне Антона Палявога «О языке населения Новозыбковского уезда Гомельской губернии», дзе сцвярджалася: «Можна смела зрабіць выснову, што мовою жыхароў-сялян Навазыбкаўскага павета ёсць мова беларуская».

Эканамічнаму адзінству БССР і Гомельшчыны быў прысвечаны зборнік Дзяржплана БССР «Материалы по районированию Западной области РСФСР. Гомельская губерния».

У гэтым зборніку быў надрукаваны артыкул Гаўрылы Гарэцкага «Насельніцтва Гомельскай губерні». Аўтар прааналізаваў перапісы насельніцтва 1897, 1911, 1917 і 1923—24 гг. і фіксацыю ў іх нацыянальнага складу жыхароў Гомельшчыны. Зафіксаваны гэтымі перапісамі рост працэнту беларусаў за кошт велікаросаў, паводле Гарэцкага, з'яўляецца вынікам натуральнага працэсу развіцця нацыянальнай свядомасці насельніцтва, і чыннікамі гэтага працэсу былі блізкасць БССР і праца беларускіх школ. Найбольшыя ваганні працэнту беларусаў рэгістраваліся на крайнім усходзе губерні, куды, зразумела, пазней і цяжэй пранікала беларуская ідэя. «Тут нацыянальная самасвядомасць распаўсюджваецца праз адзіночак-настаўнікаў гнёздамі» — пісаў Гаўрыла Гарэцкі пра Старадубскі і Навазыбкаўскі паветы.

У лістападзе 1926 г. Палітбюро ЦК ВКП(б) зацвердзіла далучэнне да БССР Гомельскага і Рэчыцкага паветаў. Зроблена гэта было найперш з эканамічных меркаванняў. За далучэнне выказаўся і Дзяржплан СССР.

У снежні 1926 г. ажыццявілася ўз'яднанне Гомельскага і Рэчыцкага паветаў з БССР, у якіх беларусізацыя школьніцтва і грамадскага жыцця стала дзяржаўнай справай.

Урад БССР рыхтаваў і наступнае далучэнне ўсходнебеларускіх земляў, якія засталіся ў РСФСР — заходніх паветаў Смаленшчыны, паўднёвых паветаў Пскоўшчыны, а таксама Старадубскага, Мглінскага і Навазыбкаўскага паветаў (яны пасля ліквідацыі Гомельскай губерні ў сувязі з узбуйненнем БССР былі далучаны да Бранскай губерні). Аднак гэтыя планы БССР не ажыццявіліся, бо нацыянальная палітыка Масквы карэнным чынам змянілася. У колішніх усходніх паветах Гомельшчыны амаль да сярэдзіны 30-х гадоў існавалі беларускія школы. Але пазней яны былі ліквідаваны разам з іншымі нацыянальнымі школамі на тэрыторыі РСФСР. Дзесяткі тысяч этнічных беларусаў на Усходзе былі пазбаўлены магчымасці захоўваць сваю культурную традыцыю і родную мову.

Юрка ВАСІЛЕЎСКІ, Алеся СЁМУХА



Рубрыку вядзе

ЛЯВОН БАРШЧЭЎСКІ

Эпоха ў французскай імпрэсіяністычнай лірыцы звязана з імем Поля Верлена (1844—1896).

Поль Верлен

Зіянне месяца

Душа твая — малюнак артыстычны:
Пад лютняў звон прыгожы масак рой
Танцуе там, адзеўшыся нязвычна,
Ў надзеі скрыць праз гэта смутак свой.

На ціхі лад усе яны спяваюць
Пра мір жыцця і светлую любоў,
Ды веры ў шчасце спевы іх не маюць,
І з ясным светлам зліты зыкі слоў,

Са светлам месяца прыгожа-смутным,
Ад чар чыіх на дрэвах птушкі сняць,
І лёгкія струі у плачы чутным
Між мармуроў натхнёна зіхацяць.

Пераклад з французскай Максіма БАГДАНОВІЧА.

* * *

Гэта — усмешка адчыньвала сенцы
Ў чэрвень, у ранак, у клопат мой чорны,—
Дзе ён?.. Адна у дзвярах яна ўзорных
У шэра-зялёнай з фальбонкай сукенцы!..

Выбегла, лёгкая, зграбная, коле
Цёплай іроніяй, порсткая, смела —
Чуў я душой, што дагэтуль змрачнела,
Дыхаць красой яе стала наўколле;

Горыч знікала пад музыкай гонкай
Шчырай яе шчабятні далікатнай,
Прад дабратой нечуванай, стакратнай,
Прад весялосцю нястрыманай, гонкай.

І, як яна, я пабег па шалфеі,
Сам, нібы бунт, што быў тут жа стаптаны,
Каб, хваляваннем ушчэнт апантаны,
Вернападданічаць зграбненькай феі.

Пераклад з французскай Алега ЛОЙКІ.

Зелень

Вось кветкі і плады, вось лісце і галіны,
І сэрца вось, што б'ецца дзеля Вас адной:
Яго не кройце Вы, і сціплае даніны
Не адкідайце Вашай белаю рукой...

Я толькі што з двара, акроплены расою,
Ад ветру схаладнелай на маім ілбе.
Дазвольце ж мне зазнаць ля Вашых ног спакою,
Імгненні шчасця блізкага ўявіць сабе —

І да грудзей дазвольце Вашых прытуліцца
Аглушанай ад пацалункаў галавой,
І пагрэмаць — пакуль не сціхне навальніца,
Пакуль Вас ахапіў прытомлены спакой.

Пераклад з французскай Лявона БАРШЧЭЎСКАГА.

Майстэрства — вечнае

Паклон сейбіту мудрасці

На 75-я ўгодкі з дня нараджэння Фёдара Янкоўскага падаравала неба цудоўны, сонечна-залаты дзень, быццам яго душа, звыклая да клопатаў,** і там паклапацілася **пра жывых людзей — родных, блізкіх, сяброў, былых вучняў, выкладчыкаў, студэнтаў, што прыйшлі на Усходнія могілкі, да яго помніка, пакланіцца яму, ушанаваць яго — настаўніка, вучонага, пісьменніка — памяць. Прырода мяккім сонечным святлом як бы вітала гэтую падзею.

БЫЛО многа людзей, многа кветак. Гучалі незавучаныя — жывыя словы. Уражваў і такі штрых: прамоўцы звярталіся да яго, як да жывога, што ішло ва ўнісон з эмацыянальнымі выступленнямі і падкрэслівала веліч асобы Фёдара Янкоўскага, жыццёвасць яго школы, якая цяпер, у варунках адраджэння нацыянальнай свядомасці, асабліва патрэбная і каштоўная нацыі. Яна, школа Ф. Янкоўскага, мае шмат паслядоўнікаў у асобе яго вучняў, сённяшніх выкладчыкаў, навукоўцаў.

Пра 75-годдзе выдатнага асветніка, пра ўшанаванне памяці Ф. Янкоўскага ў навучальнай установе, дзе ён шчыраваў шмат гадоў, хораша распачаў гаворку дэкан філалагічнага факультэта Менскага універсітэта педагагічных ведаў Аляксандр Лугоўскі.

...Слова бярэ Мікола Мішчанчук, загадчык кафедры беларускай літаратуры універсітэта. Ён сардэчна дзякуе Настаўніку за навуку не толькі звацца, а і пачуваць сябе людзьмі на сваёй зямлі.

— Шчыра дзякуем вам,— кажа прамоўца,— за тое, што вы ў складаны час, драматычны, застойны час, задушны час, у задусе, у завеі ўздымалі голас пратэсту супроць зняваг у адрас роднай мовы, роднага народа. Мы будзем кіравацца вашай бацькоўскай педагогікай, сапраўднай, шчырай, адданай, а не той казённай, заснаванай на муштры, на расчалавечванні чалавека, на здзеку з чалавека...

У выступленнях Людмілы Васюковіч, загадчыцы кафедры беларускай мовы Віцебскага педінстытута, і настаўніка Уладзіміра Дзіско прагучалі пранікнёныя словы ўдзячнасці Ф. М. Янкоўскаму. Яны гаварылі ад імя ўсіх тых, хто прайшоў праз яго розум і сэрца, эрудыцыю і вялікую чалавечнасць, ад імя яго вучняў. З пачуццём замілаванасці гаварылі пра настаўніка, вучонага, пісьменніка, абяцалі верна служыць роднаму слову, матчынай мове.

...Слова прамаўляе ўзрушаная Ніна Гаўрош, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства:

— Год таму, дарагі Фёдар Міхайлавіч, мы былі тут і рабілі справаздачу: як мы жывём, што робім для нашага краю, як выконваем вашы запаветы — «Як жыць, то жыць для Беларусі, а без яе зусім не жыць».

Прамоўца гаворыць пра яго працу, якая і сёння застаецца ўзорам для пераймання, пра яго кнігі, па якіх вучацца мудрасці і сумленнасці, пра яго навуковыя праблемы, якімі зацікавіліся не толькі ў бліжнім, але і ў далёкім замежжы.

— У такі складаны час для Бацькаўшчыны, яе культуры,— працягвала Н. Гаўрош,— мы помнім ваша слова: усё праходзіць, усё мяняецца — застаецца вечным толькі родны народ, родная зямля, якую нельга апаганіць, якую нельга прынізіць і якой трэба заўсёды служыць. Ветэран вайны Павел Шаханаў пазнаёміўся з Фёдарам Янкоўскім у суровым 1942 годзе. Тут, каля надмагільнага помніка, ён гаварыў пра Фёдара Міхайлавіча не толькі як пра мужнага разведчыка, але і як пра сумленнага, справядлівага і задушэўнага чалавека.

Ганна Дораш, загадчыца неўралагічнага аддзялення Менскай абласной дзіцячай бальніцы, з цеплынёй успамінае Фёдара Міхайлавіча Янкоўскага, які быў яе суседам, пра тое, як яго памятаюць і дарослыя, і дзеці, з якімі ён так умеў размаўляць! Яна і пазнаёмілася з ім, калі ён у двары размаўляў з яе дачкой Волечкай. Ганна Дораш прыгадвае, як аднаго разу будзіла дома сваіх родных, казала ім, што Фёдар Міхайлавіч ужо на вуліцы, і як ёй адказвалі: «А што, ён ужо сее словы?» І яна, як да жывога чалавека, звяртаецца да памяці прафесара Ф. Янкоўскага, кажа пра вялікі дар, якім яго ўзнагародзіла Прырода,— пра тонкае адчуванне слова:

— Вы ж усю Беларусь ведалі, усіх нас, усе мясцовасці, іменна па гаворках. Скажы вам, які чалавек адкуль, а вы знаходзілі нейкі выраз, словы, якія характарызуюць гэтую мясцовасць. Мяне гэта вельмі дзівіла.

Адчуваецца, што Ганне Дораш вельмі дарагая лучнасць з высокай духоўнасцю і бязмежнай чалавечнасцю прафесара Ф. Янкоўскага. Вось яшчэ колькі слоў з яе споведзі:

— Я ўсё з вамі неяк гавару, як у двор выйду, быццам бы вы там. І я хачу яшчэ раз сказаць, што ўсе помняць вас, тое, што вы пасеялі. Вы так спакойна, свабодна гаварылі. Вас, здаецца, ніколі не бянтэжыла, калі хто на «трасянцы» з вамі размаўляў, вы працягвалі гаварыць на сваёй чысцейшай залатой мове, і ўсе адчувалі яе цану, і яна пранікала ў нашы сэрцы.

Пісьменнік Генадзь Шупенька пранікнёна, з хваляваннем гаварыў пра неспрыяльны час, пра нешчаслівы лёс нашай Радзімы ў сувязі з тымі стратамі, якія несла беларуская літаратура, і заўчаснай стратай Фёдара Янкоўскага, пра тое, што ён значыць для нацыянальнай літаратуры, культуры, для нашай духоўнасці.

...Слова бярэ Аляксандр Борыс, хірург, які стараўся дапамагчы Фёдару Янкоўскаму ў найцяжэйшую часіну яго жыцця. Глянуўшы на помнік, ён прамаўляе:

— Як волат, зліўся з гэтай агромністай скалой, зліўся з сваёй зямлёй, якой ён прысвяціў сваё жыццё і якую ўславіў у сваіх творах. Фёдар Міхайлавіч крыху пануры, як быццам адчуваючы, што сёння сапраўды ёсць прычына быць такім, бо жыццё стала нялёгкае і трывожнае. Некалькі разоў пры сустрэчах ён пытаўся, ці зямля наша, Беларусь, стане вольнай і незалежнай. Гэты час прыйшоў, Фёдар Міхайлавіч, шкада, што няма вас. Хоць яшчэ да дабра не дайшло...

Далей прамоўца нагадвае, што часы, калі Ф. Янкоўскі распачаў сваю працу, былі цяжкія, бо нельга было адкрыта змагацца за беларускую мову, за правы свайго народа, і выказвае надзею, што яго святая справа заўсёды знойдзе паслядоўнікаў. А. Борыс, як і ўсе папярэднія прамоўцы, прынёс паклон Фёдару Янкоўскаму за ўсё, што ім здзейснена дзеля Беларусі, яе народа.

Завяршылася ўрачыстая цырымонія ўзрушана-прачулым словам Серафімы Андрэеўны Янкоўскай.

— Дарагія мае людзі!— звярнулася яна да ўсіх прысутных.— Нізкі і шчыры паклон вам за тое, што прыйшлі сюды, да Фёдара Міхайлавіча, ушанаваць яго памяць у яго 75-годдзе, да якога ён, на жаль, не дажыў. Кажуць, што час — добры лекар. Гэта праўда, але адзін час не вылечыць ад скрухі і болю. А вось з дапамогай увагі і пашаны яго блізкіх, знаёмых гэта можа быць. Асабліва ў наш час, калі раскіданыя мы ўсе па сваіх кватэрах, калі кругом адны праблемы.

С. Янкоўская прыводзіць канкрэтныя выпадкі такой увагі.

— Адгортваеш старонкі «Полымя», а там — цёплыя словы Барыса Сачанкі з успамінамі пра Фёдара Міхайлавіча. Гэта — як гаючыя лекі,— кажа яна.— А хіба не бальзамам з'яўляецца званок студэнта, які гаворыць: «Сёння Ніна Васільеўна Гаўрош цэлую лекцыю прысвяціла Фёдару Міхайлавічу!» Яна на яго кнігах вучыла студэнтаў мове, паказвала, як Фёдар Міхайлавіч працаваў са словам, як ён умеў вылушчыць з багацця роднай мовы дыяменты прыгажосці. Або разгортваеш старонкі «ЛіМа», а там бачыш такія словы: «Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы». Гэта Павел Місько піша рэцэнзію на кнігу Фёдара Міхайлавіча. Цёпла і хораша піша. Фёдару Міхайлавічу прысвяцілі свае вершы многія паэты, у ліку іх — Ніна Мацяш, якую ён вельмі паважаў і па-бацькоўску называў — Нінуся. Гэта ўсё — гаючыя лекі, якія дапамагаюць трошкі суцішыць боль.

Серафіма Андрэеўна распавядае пра нядаўні паклон з далёкага замежжа — ад Эдуарда Гашынца, прафесара з Брацілавы, і Карла Гутшміта, філолага з Германіі, якія добра ведалі і вельмі цанілі яго. Потым — пра цёплыя словы ад яго былога настаўніка Гургена Марціросава, армяніна, якому стала роднай Беларусь.

Удава Ф. Янкоўскага выказвае сардэчную падзяку «Нашаму слову», дзе таксама помняць Фёдара Міхайлавіча, пішуць пра яго, друкуюць абразкі і параўнанні з яго кніг. Яна шчыра дзякуе работнікам педагагічнага універсітэта, якія шчыравалі да 75-годдзя Ф. Янкоўскага: і спецыяльную газету выпусцілі, і выставу кніг зрабілі. Называюцца і Нацыянальная бібліятэка, і бібліятэка Дома літаратара, якой загадвае Ніна Адамчык,— там таксама зроблены выставы.

— Гэта ўсё, што я пералічыла,— гаючыя лекі і для мяне, і для маёй сям'і,— кажа С. А. Янкоўская.— Бо Фёдар Міхайлавіч вельмі многа зрабіў, яго творы і цяпер працуюць на нацыянальнае Адраджэнне... Нядаўна, у восьмым нумары «Полымя» быў надрукаваны артыкул Міхася Тычыны. Гэта артыкул пра Уладзіміра Калесніка, вельмі добрага літаратара. Але і ў гэтым артыкуле знайшлося слова для Фёдара Міхайлавіча. Міхась Тычына піша там, што не так багата ў нас людзей (ён дадае словы — не аблаўрэачаных), якія працавалі за цэлыя навукова-даследчыя інстытуты, і называе ў іх ліку Фёдара Янкоўскага ў мовазнаўстве. Так, ён многа зрабіў. І шкада: у яго было яшчэ вельмі многа задумаў. Ён ніколі сабе не даваў права адпачываць. Адпачынак быў не для яго. Калі ёсць жыццё на тым свеце, то Фёдар Міхайлавіч, можа, зараз глядзіць на нас усіх і разам са мною гаворыць: «Вельмі дзякую вам, людзі. Нізкі вам паклон».

Васіль ЖУКОВІЧ.

ШТО ПАГЛЯДЗЕЦЬ ПА ТЭЛЕВІЗАРЫ?

13 КАСТРЫЧНІКА, СЕРАДА

16.55. Скарбы беларускай гісторыі.
17.40. Слова. Абмяркоўваем праект Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.
18.30. Навіны Бі-бі-сі.
19.10. Творчае маладзёжнае аб'яднанне «Крок». Ток-шоу з удзелам народнага дэпутата Беларусі Зянона Пазьняка.
21.00. Панарама.
22.40. НІКа.

14 КАСТРЫЧНІКА, ЧАЦВЕР

16.25. Для школьнікаў. Ці любіце вы тэатр?
18.30. Навіны Бі-бі-сі.
21.00. Панарама.
22.40. Пазіцыя ўрада.
22.55. НІКа.

15 КАСТРЫЧНІКА, ПЯТНІЦА

17.40. Слова. Абмяркоўваем праект Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.
18.30. Навіны Бі-бі-сі.
19.10. Дыялог. Лёс беларускай дзяржаўнасці.
21.00. Панарама.
23.30. НІКа.

16 КАСТРЫЧНІКА, СУБОТА

11.15. Паказвае Віцебск.
14.30. Алё! Ёсць пытанне.
21.00. Панарама.
23.45. НІКа.

17 КАСТРЫЧНІКА, НЯДЗЕЛЯ

13.25. Адраджэнне. Культурна-асветніцкая праграма.
13.55. Літарынка.
15.30. Слова. Абмяркоўваем праект Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.
20.00. Панарама.

АФАРЫЗМЫ

Крок назад

Каб спальвалі шыбеніцы, на зямлі адбылося б пацяпленне.

Гаротная тая праўда, якая вымушана апраўдвацца.

Здрада таварышу — першая рэпетыцыя здрады радзіме.

Інструкцыя палявання на грэшнікаў: наладзь грэх і чакай, калі нехта пападзе ў яго.

Каму замнога волі, няхай будуе прыватныя канцлагеры.

Медыцына апаратам мерае ціск.

У. БУЛАТАВІЧ ВІБ

Калі чуеце, што ўсе ненадзейныя, ведайце, што гэтая мудрасць належыць безнадзейнаму ідыёту.

Аўтары ананімных лістоў у адчаі, што іхнія творы разносяць паштальёны, а не міліцыянеры.

Найгорш волі, калі яе баяцца вызваліцелі.

Горшыя лягчэй ідуць угару.

Не хваліцеся праграмамі. Праграму цяпер мае любая больш-менш вартая пральная машына.

Пераклаў з сербскахарвацкай Іван ЧАРОТА.

Заснавальнік: ТБМ імя Ф. Скарыны.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13. Тэлефон: 33-17-83

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Эрнэст Ялугін — галоўны рэдактар, Лявон Баршчэўскі, Янка Брыль, Анатоль Бутэвіч, Вінцук Вячорка, Віктар Гайсёнак, Радзім Гарэцкі, Ніл Гілевіч, Аляксей Глушко, Сяргей Запрудскі, Анатоль Клышка, Уладзімір Ламека, Зміцер Санько, Яўген Цумараў, Генадзь Цыхун, Віктар Шніп — адказны сакратар.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за дакладнасць фактаў і іншых звестак. Пункт гледжання аўтара можа не адпавядаць меркаванню рэдакцыі. Рукапісы рэдакцыя не рэцэнзуе і назад не вяртае.

Індэкс 63865. Зак. 292.

МВПА імя Якуба Коласа, Менская паліграфічная фабрыка «Чырвоная Зорка», 220079, г. Менск, 1-ы Загарадны завулак, 3. Індэкс 63865.

Наклад 7245 паасобнікаў. Падпісана ў друк 11.10.1993 г. у 15 гадзін.